Любоў Уладыкоўская

# АДКРЫЦЦЁ МАЁЙ АМЕРЫКІ,

## або Навошта беларусам ЗША?



Мінск 2012

**Liubou Uladykouskaja**

# Discovery of My America,

## Or

## Why Would the Belarusians Need the USA?

**Minsk**

**2012**

*Dedicated to Distinguished Michael Scanlan*

*Chargé d'Affaires ad Interim*

*of the USA to Belarus*

***The only thing we have to fear is fear itself.***

**Franklin D. Roosevelt**

The 32nd President of the United States (1933-1945)

## Introduction

I have three Homelands.

My dear Fatherland – Belarus. The Motherland that should be praised to the skies. The Homeland for the soul.

Poland with its human dignity, Catholicism, memory for history, and esthetic taste. The Homeland for the heart.

And there is a country associated with the most important value: Freedom. It favors and brings up strong and confident people. It shelters the poor and the destitute. It has given me the hope and prospect of the free human spirit, creativity, confidence that justice will win, joy, and optimism. The Homeland for the spirit.

I love this country enormously for noble and genuine acts of humanity, for persistent and purposeful advancement, for commitment to God and pride for Man.

People in Belarus, my Homeland, know unforgivably little about the USA. For many, America does not exist, in a way. Not only because they have never been to America, lack substantial knowledge and strong personal and profession contacts with American colleagues. Apparently, there is lack of the American Dream: invincible confidence that everything is possible.

Shortage of scientific and informative books about America in Belarusian stores, conversations with colleagues and friends whose theoretic knowledge about

this powerful and geographically remote country does not quite reflect the reality, finally, our civic initiative on the Belarusian-American cultural dialogue all have indicated the urgent need to cover or at least outline the history, development and essence of the "American phenomenon" although initially this brochure was planned as a selection of subjective reflections on America. It is vital not only to understand how Belarusians perceive America but also to comprehend multiple aspects of American experience, which could be applied and utilized more efficiently in Belarus.

Today, Belarusians by all the possible means have to maintain and strengthen the famous *tolerance* that forms the basis for intercultural dialogue, without which it is hard to imagine today any development and any decent competitiveness. It is essential to understand that we, Belarusians, should be open and perceptive to everything positive and constructive that exists in the world. It is always useful to build the bridges, to establish the dialogue, to adopt and creatively develop progressive ideas and discoveries.

To understand the specifics of American character, we should look at America from a comprehensive, broad, and nation-wide perspective. Of course, a lot of details are lost then and many issues seem simplified, but on the other hand, the entire picture is visible, and the goal here is to provide Belarusian readers with the initial knowledge about America, to try to correlate it with the Belarusian phenomenon. I find it necessary to highlight in quite scrupulous detail the aspects in the formation of the American nation that could be considered conceptual for Americans and important and useful for us in strengthening Belarusian socio-political, economic, cultural and spiritual subjectness and self-determination. Not all the aspects are accompanied with comments and parallels drawn: I intentionally left most of the work for my readers.

One can't help being inquisitive about the country that became the world leader in a short lapse of time. The United States of America set the pace and direction of development for the modern world, and not only in terms of economics and finance, but also in terms of ethics, political thought, technological breakthroughs, social programs and culture. The power of "the nation of strong people and free citizens" is determined not by economic or military diktat, but by competitive society where talent can fulfill itself and brings victory to the entire nation.

When I refer to the USA I often use the word "America". And Americans themselves do that.

There is a young and powerful, strong and promising, unique and universal country – the United States of America. Let's discover it together! It is so vast and diverse that everyone can have their own America.

As we all are born free.

*Вельмішаноўнаму Сп.Майклу Скэнлану,*

*Часоваму Паверанаму ў справах ЗША*

*ў Рэспубліцы Беларусь,*

*прысвячаецца*

***Адзінае, перад чым мы павінны адчуваць страх, – гэта сам страх.***

**Франклін Рузвельт,**

трыццаць другі прэзідэнт (1933-1945 гг.) ЗША

## Прадмова

У мяне тры Радзімы.

Мая дарагая Бацькаўшчына – Беларусь, Айчына, якая дала мне жыццё. Радзіма для душы.

Польшча, якая мацуе маю чалавечую годнасць, каталіцкую веру, гістарычную памяць і эстэтычны густ. Радзіма для сэрца.

І яшчэ ёсць краіна, якую атаясамліваюць з найважнейшай каштоўнасцю, – Свабодай. Яна любіць і выхоўвае людзей моцных і ўпэўненых. Яна дае прытулак бедным і знямоданым. Яна падарыла мне надзею і перспектыву вольнага чалавечага духу, творчасці, веру ў перамогу справядлівасці, радасць і аптымізм. Радзіма для духу.

Я бясконца люблю гэтую краіну за высокія праявы гуманнасці і сапраўднай чалавечнасці, за настойлівы і мэтанакіраваны рух наперад, за адданасць Богу і гонар за Чалавека.

На маёй Бацькаўшчыне, у Беларусі, недаравальна мала ведаюць пра Злучаныя Штаты. Для многіх Амерыкі як бы і не існуе. Не толькі таму, што няма ўласнага досведу яе наведвання, мала ведаў, слабыя персанальныя і прафесійныя кантакты з амерыканскімі калегамі. Няма, відаць, Амерыканскай Мары – нязломнай веры, што ўсё магчыма.

Амаль поўная адсутнасць у беларускіх крамах навуковай і пазнаваўчай літаратуры пра Амерыку, гутаркі з калегамі і знаёмымі, чый характар тэарэтычных ведаў пра гэтую магутную і геаграфічна далёкую краіну не зусім адпавядае рэаліям, урэшце, наша грамадская ініцыятыва па пытанні беларуска-амерыканскага культурнага дыялогу засведчылі пра пільную

неабходнасць хаця б у асноўных рысах раскрыць пытанні гістарычнага станаўлення і сутнасці “амерыканскага феномену”, хаця першапачаткова гэтая брашура задумвалася толькі як выкладанне некаторых суб’ектыўных разваг на амерыканскую тэму. Надзвычай важна не толькі зразумець, як беларусы ўспрымаюць Амерыку, але і асэнсаваць шматлікія аспекты амерыканскага вопыту, якія могуць быць паўней і эфектыўней засвоеныя і выкарыстаныя ў Беларусі.

Сёння беларусам трэба ўсяляк падтрымліваць і мацаваць *сваю* славутую *талерантнасць*, што ляжыць у аснове міжкультурнага дыялогу, без якога ў сучасным глабальным свеце цяжка ўявіць любое развіццё і хоць якую-кольвечы ступень канкурэнтаздольнасці. Важна зразумець, што мы, беларусы, мусім быць адкрытымі і ўспрымальнымі да ўсяго станоўчага і каструктыўнага, што ёсць у свеце. Заўсёды карысна будаваць масты, наладжваць дыялог, засвойваць і творча развіваць прагрэсіўныя ідэі і адкрыцці.

Для разумення адмысловага амерыканскага характару належыць зірнуць на Амерыку комплексна, шырока, у агульнанацыянальным плане. Безумоўна, у такім разе губляюцца многія дэталі і шмат што выглядае схематычным, але затое відаць цэласная карціна, ды і ставіцца тут сціплая задача толькі ў першым набліжэнні азнаёміць беларускага чытача з Амерыкай і паспрабаваць суаднесці яе з беларускім феноменам. Я палічыла неабходным даволі падрабязна спыніцца на тых момантах станаўлення амерыканскай нацыі, якія могуць быць ацэненыя як канцэптуальныя для амерыканцаў, а таксама важныя і карысныя для нас, для ўзмацнення беларускай суб’ектнасці – сацыяльна-палітычнай, эканамічнай, культурнай і духоўнай. Не ўсюды ўдалося даць свае каментары і правесці паралелі: я наўмысна пакінула большую частку працы сваім чытачам.

Краіна, якая за кароткі прамежак часу стала сусветным лідэрам, не можа не выклікаць цікавасці. Злучаныя Штаты Амерыкі задаюць тэмп і вектар развіцця ўсяму сучаснаму свету, – і не толькі эканомікай ці фінансамі, але этыкай, палітычным мысленнем, тэхналагічнымі прарывамі, сацыяльнымі праграмамі і культурай. Моц “нацыі багатыроў і вольных грамадзян” – не ў эканамічным ці ваенным дыктаце, а ў канкурэнтным грамадстве, дзе талент мае магчымасць рэалізавацца і прыносіць перамогу ўсёй нацыі.

Гаворачы пра ЗША, я часта ўжываю тэрмін “Амерыка”, – гэтак робяць і самі амерыканцы.

На свеце ёсць маладая і магутная, моцная і перспектыўная, унікальная і ўніверсальная краіна – Злучаныя Штаты Амерыкі. Давайце ж разам яе адкрываць! Яна такая неабдымная і розная, што ў кожнага можа быць свая.

Бо ўсе мы нараджаемся свабоднымі.

# 1. Што беларусы думаюць пра ЗША?

6% зямной сушы складаюць Злучаныя Штаты Амерыкі, насельніцтва якой дасягае 313 млн. чалавек. ЗША займаюць трэцяе месца па колькасці насельніцтва – пасля Кітая і Індыі, і чацвёртае – па займаемай плошчы. На асноўнай тэрыторыі – 4,4 тыс. км з усходу на захад і 2,6 тыс.км. з поўначы на поўдзень – размяшчаюцца 48 штатаў (усяго – 50 штатаў), асобна размяшчаецца штат Аляска, а таксама штат Гаваі на Гавайскіх астравах у Ціхім акіяне, які амывае ЗША з захаду, у той час як Атлантычны акіян – з усходу. Марскія межы цягнуцца ажно на 20 тыс.км, сухапутныя – на 12 тыс.34 км.

З'яўляючыся ўвасабленнем дэмакратыі і клопату пра чалавека, ЗША не падобныя ні на якую іншую краіну. ЗША – гэта цэласная шматаблічная краіна, якая аб'ядноўвае ў сваіх межах разнастайныя культуры, што размясціліся на велізарных тэрыторыях. Гэта дзяржава, якая складаецца з мноства розных земляў; нацыя, якая вырастае з цэлага суквецця разнастайных культур; месца, дзе стваралі сабе Радзіму людзі з розных куткоў свету. Гэта краіна кантрастаў: тут ёсць палярная тундра і трапічныя джунглі, нацыянальныя паркі змяняюцца дзіўнымі фарбамі вуліц Нью-Йорка і Лос-Анджэлеса, дзе ёсць месца магічным абрадам індзейскіх плямёнаў і грандыёзным шоу Лас-Вегаса.

Нягледзячы на непаўторнасць кожнага штата, усе амерыканцы маюць шмат агульнага – любоў да свабоды, веру ў свае магчымасці, заўсёднае імкненне наперад. І яшчэ ўсе амерыканцы – вялікія патрыёты. Яны, як і беларусы з іх любоўю да роднага кута, надзвычай цэняць малую радзіму – свой штат, кожны з якіх уладкаваны па-свойму.

Няспынная кругаверць, нежаданне і няўменне сядзець на месцы, гатоўнасць кідаць выклік усяму і ўсім – гэта было ўласціва амерыканцам яшчэ ад XIX ст. Неабдымныя прасторы, якія доўга чакалі сваіх пасяленцаў на Захадзе, колішняя таннасць зямлі ўсяляк спрыялі фарміраванню менавіта гэтай рысы.

Каб зразумець, як беларусы ўспрымаюць Амерыку, што пра яе ведаюць і як думаюць, а таксама з мэтай заахвочвання набыцця ведаў па амерыканскай культуры Цэнтрам міжкультурнага дыялогу пры падтрымцы Амбасады ЗША летам 2011 г. быў абвешчаны **конкурс "Амерыканская культура: якая яна?"** у дзвюх намінацыях: "Прывабнасць амерыканскай культуры" і "Беларускія акцэнты ў амерыканскай культуры". У конкурсе ўзялі ўдзел 50 чалавек. Пададзеныя на конкурс працы якрава засведчылі пра два асноўныя стэрэатыпы, якія пануюць у сучасным беларускім грамадстве адносна амерыканскай культуры: амерыканская культура – гэта толькі масавая

культура, псеўдакультура, у лепшым выпадку – культура вулічная, і другі – ў Амерыцы, як у плавільным катле, цалкам губляецца культурная самабытнасць і фарміруецца вобраз гамагеннага амерыканскага характару.

Гэта не зусім так. Не трэба забываць, што, з аднаго боку, для фарміравання нацыянальнага стылю патрабуецца нейкая аднароднасць і папулярнасць, з іншага ж, Злучаныя Штаты застаюцца нацыяй нацый і культурай культур. Злучаныя Штаты Амерыкі ўнеслі велізарны ўплыў у сацыяльнае развіццё чалавецтва. У якасці прыкладу варта ўзгадаць 1963 год, калі з палымянай прамовай “У мяне ёсць мара…” выступіў Марцін Лютэр Кінг (малодшы), дзе акрэсліў мэту імкненняў афраамерыканскіх змагароў за свае правы – справядлівасць і чалавечае братэрства; тады ж выйшла ў свет і кніга Бэці Фрыдан “Тайна жаноцкасці”, якая паклала пачатак магутнаму феміністычнаму руху.

Амерыканская культура – гэта перадусім магутная класічная літаратура (Э. По, В. Ірвінг, Ф. Норыс, М. Рыд, Ф. Купер, Э. Дзікенсан, Г. Мелвіл, М. Твэн, Дж. Лондан, Т. Драйзер, О’Генры, Э. Сінклер, С. Льюіс, У. Фолкнер, Э. Хемінгуэй, Ф. С. Фіцджэральд, Дж. Стэйнбек, Т. Вулф, Дж. К. Сэлінджэр), узбагачаная этнічнымі плынямі (творчасць Клода Маккея, Джына Тумера, Зоры Ніл), гэта ўнікальнае музычнае мастацтва (узгадайма, што джаз (і лепшыя яго выканаўцы, як Луі Армстронг, Бесі Сміт) і рок-н-рол (Элвіс Прэслі) нарадзіліся ў ЗША, як і ўнікальныя эстрадныя спевы Фрэнка Сінатры), гэта адмысловыя школы жывапісу і кінематографа.

І ўсё ж амерыканская культура – гэта перш за ўсё сістэма каштоўнасцей і адпаведны лад жыцця, які пранізвае ўсе сферы чалавечага існавання і які многім з удзельнікаў конкурсу ўдалося ўбачыць і адчуць.

У працы пераможцы конкурса, шаноўнага *Васіля Аўраменкі*, які ніколі(!) не быў у ЗША і паводле роду сваіх заняткаў далёкі ад гуманістыкі, культура якраз і разглядаецца як агульнанацыянальны феномен – шматстайны, неадназначны, часам да парадаксальнага супярэчлівы, але арганічна цэласны. Як слушна заўважае аўтар “культурнае поле – гэта другая (а сёння бадай ужо і першая) пасля эканомікі сфера, дзе амерыканскія перамогі найбольш відавочныя. І поспех гэты абумоўлены тым, што амерыканская культура выявілася найлепш прыстасаванай для сучаснага жыцця, яго тэмпу і ладу, спакусаў і праблем. У рэшце рэшт, і само сённяшняе жыццё ў вялікай ступені сфармавана пад уплывам Амерыкі. Культ поспеху і багацця, сямейнага дабрабыту і паўсядзённай “усмешкі шчасця”, тэлевізійных шоў і галівудскіх кіна-казак, хуткага харчавання і барацьбы з атлушчэннем – гэта тыя “цаглінкі” глабальнай маскультуры, якія маюць выразнае амерыканскае паходжаньне. Галоўны экспарт ЗША – даўно не прамысловыя тавары, і нават ужо не зялёныя паперкі з партрэтамі

прэзідэнтаў, а прадукцыя ... амерыканскай культуры. Яе цяжка ацаніць у грашовым эквіваленце, таму што гэта не толькі кіно, музыка, літаратура, навуковая ці мас-медыйная інфармацыя, але і палітычная, прававая ды побытавая культура, якая стала звычайнай для самой Амерыкі, але застаецца “недасяжна-ўзорнай” для большасці краін свету. Імкненне калі не дагнаць, то хаця б стаць падобнымі на амерыканцаў было не толькі ў савецкіх бонзаў, але і ў людзей самых розных ідэалогій і рас. І не дзіва: жадаючых быць падобнымі на багатых і шчаслівых заўсёды больш, чым на бедных і нямоглых. Праўда, тыповыя беларусы, нават на фоне сваіх суседзяў (і ва ўласным уяўленні таксама) заўсёды прэзентаваліся як “бедныя меланхалічныя аўтсайдары”. У гэтым сэнсе яны ёсць антыподам паспяховым і самаўпэўненым амерыканцам. Выключэнне, бадай, складаюць нашы пратэстанты…”

Шаноўны В.Аўраменка прадэманстраваў не толькі добрае веданне “амерыканскага феномену”, але і ўменне сістэмна прааналізаваць яго, а таксама супаставіць з беларускім культурным сусветам. Расквецілі эсэ асабістыя ўспаміны і ўражанні. І, безумоўна, вобразная накіраванасць у будучыню: “Я памятаю, як упершыню “адкрыў” Амерыку. Гэта было ў самым пачатку 70-х, калі бацька прывёз са сталічнай камандзіроўкі рэкламны альбом амерыканскай архітэктуры. Для хлопчыка, які вырас сярод драўляных баракаў і “хрушчовак” ды з заміраннем сэрца ўзіраўся ў спаруды “сталінскага класіцызму”, амерыканскія хмарачосы, авангардныя (прыватныя!) вілы і грамадскія будынкі ў выглядзе ці то караблёў, ці то самалётаў здаваліся калі не праявамі незямной цывілізацыі, то, прынамсі, вяршыняй фантазіі і творчых здольнасцей чалавека. Вось гэтая футурыстычнасць, скіраванасць амерыканскай культуры ў будучыню ці, хутчэй, існаванне на мяжы магчыма-немагчымага (што яскрава засведчана ў архітэктуры), мне здаецца, і з’яўляецца адной з прычын яе папулярнасці ў свеце. Еўропе, абцяжаранай тысячагадовай гісторыяй і класічна-музейнай спадчынай, ніяк не ўгнацца за юнай Амерыкай, “класіка” якой пачала стварацца ў ХХ стагоддзі. А тое, што гэты працэс не скончыўся, і што ў ім можа прыняць удзел любы чалавек любой нацыянальнасці, дадае лішнія стымулы і перспектывы амерыканскай культуры”.

Многія працы парадавалі тым, што іх аўтары не толькі маюць сваё яркае светабачанне, але ўласны стыль у выкладанні думак, свой почырк, а галоўнае, – сваю надзею. Як піша чатырнаццацігадовы *Аляксандр Леўнікаў*, які заняў другое месца, працалюбства, актыўнасць, адкрытасць, незалежнасць, упэўненасць, пачуццё асабістай свабоды, нязломныя вера і надзея – вось што радуе ў амерыканцаў і варта пераймаць нам, беларусам.

Трэцяе месца падзялілі *Аляксандр Урбановіч*, які здолеў убачыць у амерыканскай культуры культуру глабальную, і *Вольга Кастрамінава*, чыё эсэ з малюнкамі “Квартал у Чыкага: іншы сусвет культурнай супольнасці” прывабіла акцэнтацыяй увагі на культурна-побытавым ландшафце навакольнай прасторы, а таксама на канкрэтным паказальным прыкладзе культурнай разнастайнасці.

Пра змяненні ў сваім светапоглядзе пасля ўсяго аднаго канкрэтнага выпадку, які здарыўся з аўтарам у Злучаных Штатах, – прыкладзе сапраўднай чалавечай дабрыні, – расказаў у сваім эсэ "Прабачце за дождж" *Аляксандр Сянюць* – з захапленнем да дзіўнай, нязвыклай, казачнай, прыцягальнай Амерыкі і яе культуры!

Прыемна ўзрушыла экспертаў і вершаванае эсэ “Некалькі культур Амерыкі” *Віктара Ліцьвінава*, які невялікімі штрыхамі, выключна арыгінальна і трапна акрэсліў амерыканскую культуру асяроддзя, вынаходніцтва, супольнага пражывання, якасці, язды на аўтамабілі, фермерскага земляробства, тэатру, жыцця, мастацтва ветру, гукаў, здароўя, суду, пітва, кіно, цяпла, хуткасці часу, прэзідэнцтва, пошты, нацыянальнага сцяга, энергіі, Божага Нараджэння, літаратуры.

Аляксандру Сянюцю і Віктару Ліцьвінаву Журы вырашыла прысудзіць Спецыяльныя прызы. Заахвочвальныя прызы – *Алесі Унукоўскай* за эсэ “Уплыў амерыканскай літаратуры на развіццё асобы чалавека” і за гатоўнасць перадаваць сваю любоў да амерыканскай літаратуры іншым людзям, і ў першую чаргу свайму маленькаму сыну; *Леаніду Шуру* за эсэ – скарочаны варыянт кнігі, напісанай па выніках паездкі ў ЗША ў межах праграмы “Развіццё прадпрымальніцтва”, асабліва ж за разуменне ролі дабрачыннасці, за ўменне бачыць добрае, за жаданне палепшыць сябе і свет; маладым аўтарам *Аляксандры Гуліцкай* і *Эрвіну Нетылеву* –за іх гарачае імкненне бліжэй пазнаёміцца з амерыканскай культурай.

Сярод малюнкаў вартым асаблівай увагі аказаўся эстамп *Уладзіміра Грамовіча* “Усе Роўныя. Розныя”, дзе, дэманструючы сваё чыста прафесійнае майстэрства мастака, аўтар заклікае берагчы нацыянальна-культурную адметнасць і ўласную сутнасць. Сярод фатаздымкаў – “Першы крок да перамогі” (помнік Тадэвушу Касцюшку: ураджэнец Беларусі, які прыносіў амерыканцам перамогі ў вайне за незалежнасць з 1776 па 1783 гг., на фоне хмарачосаў пачатку XXI ст. “кранае” шабляй маладзік і “прадказвае”, што амаль праз два стагоддзі, у 1969 г., гонку да Месяца амерыканцы выйграюць таксама не без удзелу беларуса – Барыса Кіта) у аўтарстве *Яўгена Казанцава* і “Каля помніка змагарам за свабоду і незалежнасць Беларусі” у аўтарстве *Марыны Яўсейчык*.

Апроч сказанага, асноўныя моманты ва ўспрыманні беларусамі амерыканскай культуры можна акрэсліць наступным чынам:

амерыканскі народ – народ з высокімі маральнымі і духоўнымі якасцямі, працавіты; амерыканская моладзь дбае пра сваю будучыню, самастойная (Саша, 17 гадоў);

амерыканская культура – лакмусавая паперка ўзаемаадносін ЗША і астатняга свету, яна дэманструе не толькі візуальнае багацце і яркасць фарбаў, але апалітычнасць і адсутнасць ідэалогіі, адкрытасць замежным уплывам, прычым “амерыканская культура не пераўтварыла ўвесь свет у нейкую копію Штатаў, а наадварот, схільнасць ЗША да ўспрымання ўплываў замежных культур зрабілі Амерыку свайго роду копіяй свету” (Аляксандр, дзяржаўны служачы, 27 гадоў);

амерыканцы – не толькі нацыя эмігрантаў, але нацыя вернікаў, невыпадкова на Статуі Свабоды, якой сёлета споўнілася 125 гадоў, напісана: “Я прыму бедных і зняможаных” (Віктар, узрост невядомы);

амерыканскія каштоўнасці – гэта воля, сям’я, аптымізм, вера ў сябе, працалюбства, павага да асобы, шанаванне індывідуальнасці (Вольга, узрост невядомы);

Амерыка – краіна магчымасцей для раскрыцця патэнцыялу асобы (Эрвін, 19 гадоў);

Амерыка – гэта імкненне кожнага да пастаяннага руху наперад, у адрозненне ад беларусаў з іх статычнасцю і меланхоліяй; Амерыка – гэта моцна выяўленая грамадская самасвядомасць; Амерыка – гэта калейдаскоп розных культур і традыцый, дзе кожны чалавек, аднак, ідэнтыфікуе сябе з уласнай культураю, паважае культуру іншага і ганарыцца тым, што ён – амерыканец (Аліна, 22 гады);

ЗША – гэта талерантнасць, шматкультурнасць і шматрэлігійнасць, глабальныя памкненні, індывідуалізм, гераізм (Уладзімір, 59 гадоў);

гістарычна амерыканскія земляробы і фермеры блізкія беларусам, якія здаўна апрацоўвалі зямлю і вызначаліся патрыярхальнасцю і натуральнасцю існавання; індзейскі фальклор супастаўляльны з беларускімі язычніцкімі міфамі (Ірына, 57 гадоў).

Конкурс, такім чынам, засведчыў, што беларусы адкрытыя свету, цікавяцца амерыканскай культурай і гатовыя ўспрымаць лепшае, што яна прапануе.

У цэлым беларусы зайздросцяць амерыканскаму духу і характару, амерыканскай сіле і рашучасці. Амерыканцы паўстаюць як гордая нацыя, якая мае вялікае пачуццё ўласнай годнасці, патрыятызму і незвычайнай свабодалюбівасці. Гэтая свабодалюбівасць выяўляецца абсалютна ва ўсім: у адсутнасці залішняй цэрыманіяльнасці, у дэмакратычных манерах, у

простасці быту. Амерыканцы – нацыя, якая цэніць дзелавітасць. У гэтае паняцце ўкладваюцца дакладнасць, арганізаванасць, прадпрымальнасць, уменне знаходзіць найбольш рацыянальныя рашэнні, глыбокая кампетэнтнасць, незалежнасць у меркаваннях і прыняцці рашэнняў. І адначасова амерыканцам уласцівыя лёгкасць, адкрытасць характару, бадзёрасць, жывасць, прастадушнасць, непасрэднасць, пачуццё гумару і, безумоўна, славутая амерыканская ўсмешлівасць!

Патрабуюцца, аднак, спецыяльныя сацыялагічныя даследаванні па пытанні стаўлення і ўспрымання беларусамі амерыканскай нацыі, што зусім у нас не распрацавана.

**Амерыканістыка як навуковая дысцыпліна** паўстала ў Беларусі зусім нядаўна. Як вядома, у Акадэміі навук СССР існаваў Інстытут ЗША і Канады. Пасля ўтварэння суверэннай дзяржавы Рэспубліка Беларусь ўзнікла вострая патрэба развіцця беларускай амерыканістыкі, у тым ліку з навуковымі мэтамі. У 1994 г. быў створаны Цэнтр амерыканістыкі (у ЕГУ), які, па словах прафесара Юрыя Стулава, бачыўся як інтэграцыя навукі, адукацыі і асветніцкай дзейнасці і які паклаў пачатак беларуска-амерыканскаму супрацоўніцтву ў галіне вышэйшай адукацыі. У тым жа 1994 годзе быў створаны Цэнтр амерыканістыкі ў БДПУ імя М.Танка, які ўзначаліла прафесар Таццяна Камароўская і які займаецца пераважна пытаннямі амерыканскай літаратуры (уключаючы этнічныя літаратуры, як творчасць Тоні Марысана, Эліса Уокера, Філіпа Рота), арганізацыяй міжнародных навуковых канферэнцый з удзелам амерыканскіх навукоўцаў (амерыканістыка разглядаецца як прадмет навуковага пазнання) і асветніцкіх мерапрыемстваў. У пэўнай ступені гісторыя і геаграфія ЗША вывучаюцца ў курсе “Краіназнаўства” на спецыяльнасці “замежная (англійская) мова” ў МДЛУ, а амерыканская літаратура – у курсе “замежная літаратура” на філалагічных спецыяльнасцях. Беларускі дзяржаўны універсітэт стаў першым цэнтрам у Беларусі, дзе студэнты-культуролагі могуць выбраць спецыялізацыю “амерыканістыка” (зноў жа, з акцэнтам на амерыканскую літаратуру).

У 90-ыя гады мінулага стагоддзя Беларусь параўнальна добра развівала сувязі са Злучанымі Штатамі ў галіне **вышэйшай адукацыі**. Гэта і не дзіўна, бо сістэма вышэйшай адукацыі ЗША – каталізатар сусветнай сістэмы адукацыі: вядомы Балонскі працэс прыняў за ўзор амерыканскую форму арганізацыі падрыхтоўкі спецыялістаў у вышэйшай школе. Развіццё асобы, індывідуальны падыход, плюралізм, мультыкультуралізм – гэтыя канцэпты надзвычай актуальныя ў сучасным свеце. Прафесар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта Людміла Рычкова вызначае ў якасці эфектыўных

наступныя характарысткі вышэйшай адукацыі ЗША: даступнасць; інавацыйная ўспрымальнасць; гнуткасць і празрыстасць; арыентаванасць на патрэбы і развіццё грамадства і канкрэтнай асобы; падтрымка навучання праз усё жыццё; максімальны плюралізм (а не ўніфікацыя); забеспячэнне навучэнцам прафесійных і метапрафесійных ведаў і ўменняў, арыентаваных на будучыню; развіццё адукацыйных і карпарацыйных партнёрстваў; наяўнасць інтэрдысцыплінарных адукацыйных праграм; улік патрэбаў рэгіёнаў. Менавіта ў ЗША ўпершыню была выразна акрэслена трэцяя складковая адпавядальнасці выкладчыка ВНУ, акрамя традыцыйных даследчай (research) і дыдактычнай (teaching), якая можа быць названа сацыяльна-культурнай (service). Заслугоўваюць асаблівай увагі і экстэнсіянальныя цэнтры (Extention Centers), асноўнай місіяй якіх з'яўляецца распаўсюджванне сацыяльна карысных ведаў, напрыклад, арыентаваных на тэхналогіі захавання здароўя, павышэнне эфектыўнасці фермерскіх гаспадарак, умацаванне сям'і або на працу з дзецьмі. У ЗША надзвычай шмат разнастайных пляцовак нефармальнай адукацыі, арыентаванай на ўсебаковае развіццё асобы.

Што датычыць **рэлігійных кантактаў** Беларусі і ЗША, то яны, на думку кіраўніка Аддзела адукацыі і катэхізацыі Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы а.Аляксандра Шымбалёва, могуць быць акрэсленыя паводле трох наступных напрамкаў: удзел ў канферэнцыях і навуковых праграмах; абмен вопытам у адукацыйных праектах па хрысціянскім выхаванні моладзі; абмен вопытам у арганізацыі парафіяльнага жыцця. Яго Эксцэленцыя біскуп Антоні Дзямянка, генеральны сакратар Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў Беларусі, падкрэсліваючы ўніверсальнасць Каталіцкага Касцёла, акцэнтуе асаблівую ўвагу на канкрэтных постацях святароў у гістарычнай рэтраспектыве, як, напрыклад, а.Вальтэр Цішак (1940-ыя гг.), які ажыццяўляў місіянерскае служэнне ў нашых дзвюх краінах.

Як слушна заўважыў у 1925 г. прэзідэнт ЗША Калвін Кулідж, “Справа Амерыкі – гэта **бізнес**!” Без экамічнай, бізнес-складковай амерыканістыку ўявіць немагчыма. Амерыканскі вопыт асабліва яскрава пацвярджае, што не існуе асобна гуманітарнах, сацыякультурных, эканамічных і іншых пытанняў. Усё звязана, узаемапераплецена і ўзаемазалежна ў адзіным, цэласным сацыяльным арганізме. І паляпшэнне дзелавога клімату, і развіццё дзяржаўна-прыватнага партнёрства, як, зрэшты, і вырашэнне любых іншых эканамічных пытанняў, магчымае толькі пры сучасных падыходах – сістэмных, міждысцыплінарных. З гэтага пункту гледжання важна забяспечыць дыялог розных сацыяльных груп – бізнес-супольнасці, акадэмічнай і культурнай эліты, разнастайных рухаў і ініцыятыў, чым і займаецца Цэнтр міжкультурнага дыялогу. Дыялог прадугледжвае сур’ёзную,

глыбокую і прафесійную дыскусію, калі калектыўны розум нараджае новыя ідэі і падыходы. І самае важнае, людзі абсалютна markdown розду заняткаў маюць магчымасць разам абмеркаваць адну сацыяльна важную праблему. У такой міждысцыплінарнасці, комплексным і практычным падыходзе заключаецца стыль дзейнасці нашага Цэнтра, які, да таго ж, грунтуецца на фундаментальных беларускіх каштоўнасцях.

Спецыфіка нацыянальнага бізнесу (і культура прадпрымальніцтва, і культура інавацый, і культура інвеставання, даследаваннямі чаго займаецца Цэнтр), моцна залежыць ад беларускіх культурных традыцый, нашых стэрэатыпаў, ментальных установак, каштоўнасцей, і гэта трэба ўлічваць і пры распрацоўцы нацыянальнай платформы бізнесу, і ў міжнароднай дзейнасці. Заўсёды належыць памятаць, што, праводзячы міжнародныя сустрэчы, канферэнцыі, выязджаючы за мяжу, рыхтуючы буклеты і т.п., мы прэзентуем сваю краіну і павінны садзейнічаць прасоўванню брэнда “Беларусь” у свеце. Адсюль – адказнасць і за прысутнасць (або адсутнасць) беларускай мовы, беларускай культурнай складковай увогуле. Апроч таго, менавіта культурная спецыфіка – асноўны прыцягальны фактар у турыстычным бізнесе, ён немалаважны і ў інвестыцыйнай палітыцы, пра што абсалютна відавочна сведчыць сусветны вопыт.

Вывучаючы і пераймаючы замежны вопыт, асабліва важна ўлічваць сацыякультурны фактар і нашай краіны, і кожнай з замежных краін. Без гэтай умовы канструктыўнае выкарыстанне сусветнага вопыту немагчымае.

У сучаснай Беларусі бізнес часта супрацьстаўляецца грамадству як той сацыяльны сектар, які пастаянна нечага патрабуе, вымагае. Між тым прадпрымальніцтва – частка ўсёй сацыяльнай супольнасці, па вызначэнні – самая мабільная, актыўная і прагрэсіўная.

Нацыянальная платформа бізнесу, якая штогод аднаўляецца беларускімі дзелавымі коламі, увабрала ў сябе якраз амерыканскі вопыт фармулявання бізнес-аджэнды для ўраду і грамадзянскай супольнасці.

Менавіта бізнес можа і павінен актыўна несці ў свет веды пра Беларусь праз сваю дзелавую актыўнасць, разнастайныя бізнес-праекты, ствараючы станоўчы імідж краіны, што выгадна ўсім, а ў беларускай сітуацыі з нашай экспартна арыентаванай эканомікай – асабліва. Бізнес праз культурную, народную дыпламатыю можа стаць больш гнуткім, і ў выніку і прадпрымальнікі будуць багацець, і краіна будзе багацець! (Нельга думаць, што калі нехта багацее, то нехта бяднее; можна багацець усім разам! Варта не дзяліць “пірог дабрабыту” на мноства маленькіх кавалкаў, а зрабіць яго большым, каб хапіла кожнаму).

Сацыяльная адказнасць бізнесу – гэта, такім чынам, не толькі неабходнасць спраўна плаціць падаткі ў бюджэт. Бізнес павінен быць

цывілізаваным, культурны пачатак у прадпрымальніцтве надзвычай важны. Прадпрымальнікі мусяць быць носьбітамі не толькі інтэрнацыянальнай субкультуры бізнес-супольнасці, але і культурных, і духоўна-маральных каштоўнасцей уласнай краіны, найлепшым прыкладам чаго могуць выступаць Злучаныя Штаты.

У аснове амерыканскай сістэмы бізнесу ляжыць прынцып, згодна з якім толькі арганізаваная свабода і роўныя магчымасці для людзей могуць падштурхнуць ініцыятыву і прадпрымальнасць на шляху да прагрэсу. Менавіта на такі пасыл абапіраўся Прэзідэнт ЗША Франклін Рузвельт, на чые плечы выпала неабходнасць адольваць Вялікую Дэпрэсію 1929 – 1933 гг. Яго грандыёзная праграма рэформаў па ўсталяванні сацыяльнай справядлівасці (першы і другі “новыя курсы”) прадугледжвала: ільготныя ўмовы для вядзення бізнесу, але таксама кодэкс “сумленнай канкурэнцыі”; павышэнне адказнасці федэральных уладаў, але таксама актуалізацыю грамадскай актыўнасці і нацыянальнай салідарнасці. Была знойдзена гармонія індывідуалізму, мінімалізму, дэцэнтралізацыі (на што абапіраюцца рэспубліканцы) і калектыўнай адказнасці, а таксама роўных магчымасцей для кожнага (на што арыентуюцца дэмакраты). Самадысцыпліна, сціпласць, працалюбства амерыканцаў сфарміравалі характар дэмакратычны, рухомы, схільны да індывідуалізму. Простасць, уласцівая амерыканцам, выключае карупцыю і тыранію, садзейнічае квітненню свабоды, роўнасці, шырокай грамадскай актыўнасці людзей.

Амерыканскі вопыт вядзення бізнесу вывучаецца і засвойваецца беларускай дзелавой супольнасцю, у тым ліку дзякуючы магчымасцям наведвання ЗША. Лепшы прыклад тут – Бізнес-саюз імя праф. Куняўскага (Старшыня Праўлення – Г.Бадзей), які паспяхова рэалізаваў шэраг праграм па развіцці малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

Як лічыць кіраўнік іншай бізнес-асацыяцыі – Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў – У.Карагін, уплыў ЗША на беларускі бізнес, апроч іншага, ляжыць у сферы: інфраструктуры (маецца на ўвазе перш за ўсё роля фондавых біржаў), дзелавой культуры Амерыкі, развіцці асобных відаў бізнесу, уплыву на спажывецкі рынак (у ЗША ў 1892 г. выйшаў першы ў свеце антытрастаўскі закон, накіраваны на ахову спажыўца), ролі бізнес- асацыяцый, эдвакасі (працы з усімі галінамі ўлады, шырокай рэпрэзентацыі бізнесу ў органах дзяржаўнага кіравання), кластэрных падыходаў, жаночага бізнесу.

У ЗША існуе мноства дробных і сярэдніх фірмаў, многія з якіх дзейнічаюць самастойна, знаходзячы свае нішы на рынку. Але і буйны капітал не пакідае іх без увагі, улічваючы павышаную манеўранасць малога бізнесу, яго гнуткую адаптацыю да запытаў рынку, магчымасць эканоміі на

ўсіх відах выдаткаў. Праз кантрактную сістэму, субпадрад, тэхналагічную залежнасць малы і сярэдні бізнес прывязваецца да буйнага як да ўстойлівага рынку, крыніцы забеспячэння, фінансавання, новай тэхналогіі.

Для забеспячэння ўстойлівага росту вытворчасці ў ЗША створана і функцыянуе самая перадавая навукова-даследчая і канструктарская база.

Паводле слоў Часовага паверанага ў справах ЗША ў Рэспубліцы Беларусь Майкла Скэнлана, прамоўленых падчас Першага міжнароднага форуму прадпрымальніцтва ў Мінску 16 лістапада 2011 г., прадпрымальніцтва прадугледжвае імкненне да інавацый, свабоднае распаўсюджванне інфармацыі і стварэнне новых перспектыў у бізнесе. Яно таксама ўключае ў сябе магчымасці асабістых і арганізацыйных змяненняў. Амерыканскі вопыт прадпрымальніцтва паказвае, што знаходлівасць, творчы і інавацыйны падыход павінны ісці знізу ўверх. Менавіта таму так важна мець адкрытае асяроддзе, якое дае прадпрымальнікам свабоду і магчымасць адаптавацца. Без адкрытага асяроддзя творчы патэнцыял будучых Білаў Гейтсаў, Сціваў Джобсаў і Маркаў Цукербергаў будзе непазбежна падаўляцца непаваротлівымі рашэннямі “зверху”.

У той самы час, калі тэхналагічныя цэнтры, навуковыя паркі, бізнес-інкубатары і венчурныя фонды адыгрываюць значную ролю ў прасоўванні інавацый, трэба гаварыць і пра пашырэнне магчымацей чалавека, змяненні стылю мыслення. Інавацыйныя ідэі арганічна развіваюцца пры наяўнасці адпаведных умоў, якія дазваляюць таленавітым людзям увасабляць у жыццё свой творчы патэнцыял.

Прэзідэнт ЗША Барак Абама неяк сказаў, што … “аб’яднаўшы нашыя таленты і інвестуючы ў творчасць і фантазіі нашага народа, мы можам рухацца наперад, ідучы за духам надзей і імкненняў, якія вызначылі наша мінулае і будуць весці нашу краіну наперад і далей”.

**Што датычыць беларусістыкі ў ЗША, то для яе развіцця давядзецца прыкласці яшчэ вельмі шмат намаганняў.**

Пасля Другой сусветнай вайны сярод беларускіх эмігрантаў было шмат інтэлектуалаў (Янка Станкевіч, Яўхім Кіпель, Юрка Віцьбіч, Масей Сяднёў, Уладзімір Сядура, Антон Адамовіч, Янка Запруднік і інш.), якім, аднак, не ўдалося стварыць адмысловага беларускага акадэмічнага асяродка. У 1951 г. быў заснаваны Інстытут навукі і мастацтваў у Нью-Йорку, які, па словах гісторыка Наталллі Гардзіенка, ёсць хутчэй грамадска-навуковай структурай беларускай дыяспары. Пэўна, вялікую ролю адыгралі і выданні беларускай дыяспары, якія выходзілі ў Злучаных Штатах (як піша прафесар Ніна Баршчэўская, пераважна грамадска-літаратурнага і культурна-асветніцкага напрамку): у Нью-Йорку – часопісы “Летапіс”, штомесячнік “Беларус” (з

1950 г.), навукова-літаратурны часопіс “Веда” (1951 –1954 гг.), “Народным Шляхам”, выданне БІНіМ “Запісы” (з 1952 г.), “Сялянскі кліч”, “Конадні”, “Беларуская моладзь” (у 1959 – 1967 і ў 1972 – 1980 гг.), грамадска-палітычны і літаратурна-мастацкі часопіс “Беларуская думка”, “Навіны з Беларусі” (1963 – 1969 гг.), “Змагар”, “Незалежнік”; грамадска-літаратурны часопіс “Віці” (1952 – 1957 гг.); у Чыкага – “Весткі”, навуковы часопіс “Літва”, скаўцкі часопіс “Юнак”, “Рада “Кругу”; у Кліўлендзе – “Уздым”; у Саўт-Рыверы – газета “Беларускае слова”, грамадска-палітычны і літаратурна-мастацкі часопіс “Беларуская думка”. Некаторыя выданні, як “Запісы” і “Беларус”, выдаюцца да сённяшняга дня.

Увогуле ж, як сцвярджае прафесар Вячаслаў Мянькоўскі, у 1950—1960 –ыя гады ўсе больш-менш буйныя ўніверсітэты ЗША займелі цэнтры, якія займаліся вывучэннем краін з камуністычнай ідэалогіяй, у тым ліку Савецкага Саюза. Для каардынацыі правядзення саветалагічных даследаванняў у 1948 г. была створана Амерыканская асацыяцыя развіцця славяназнаўства (American Association for the Advancement of Slavic Studies). У 1968 г. была заснавана Міжнародная арганізацыя навуковых даследаванняў і абменаў (*IREX*), якая займалася адміністраваннем абменных праграм паміж ЗША, з аднаго боку, і СССР і дзяржавамі Усходняй Еўропы, з іншага.

Да самага канца XX стагоддзя ў ЗША не існавала акадэмічных беларусазнаўчых цэнтраў, і толькі ў 2006 г. у штаце Канзас, на базе аднаго з каледжаў, паўстаў Цэнтр беларускіх даследаванняў (кіраўнікі – Марыя Паўла Сурвіла, Джэймс А.Шэпард, Дэвід Суорц), які шчыльна супрацоўнічае з Паўночна-амерыканскай асацыяцыяй беларусістаў на чале з Дэвідам Марплзам. Агульныя веды пра беларускую мову даюцца ў межах курсаў па гісторыі ўсходнеславянскіх моў, што чытаюцца ў шэрагу універсітэтаў ЗША, у тым ліку ў Гарвардскім. Верагодна, існуюць іншыя, адзінкавыя выпадкі вывучэння беларускай мовы ў Амерыцы.

Відавочна, што беларусам належыць актыўна, мэтанакіравана, сістэмна, комплексна, праз усе магчымыя формы (дзяржаўныя, грамадскія, прыватную ініцыятыву), усялякімі годнымі спосабамі распаўсюджваць веды пра сваю краіну – свой народ і сваю культуру.

Зразумела, найлепшыя вынікі будуць тады, калі нашы ўласныя веды пра сваю нацыю і наша культурная адметнасць будуць квітнець у першую чаргу на роднай зямлі.

Выслоўе, што імідж фарміруе асобу, а стыль робіць яе незабыўнай, можна лічыць справядлівым і ў дачыненні да цэлай краіны.

Амерыканцы маюць рацыю, калі цэняць асобу, індывідуальнасць. Невыпадкова Д.Эйзенхаўэр, трыццаць чацвёрты прэзідэнт (1953-1961 гг.)

ЗША, любіў паўтараць: “я кансерватар, калі справа датычыць грошай, і ліберал, калі справа датычыць людзей”.

## 2. Станаўленне амерыканскай нацыі.

Гісторыя Амерыкі – гэта перш за ўсё гісторыя іміграцыі, якая пачалася (з Азіі і, магчыма, з Еўропы, марскім шляхам) яшчэ 16 тыс. гадоў таму назад. Па іншай версіі – 12 тыс. гадоў таму назад Амерыка пачала засяляцца паляўнічымі з Усходняй Сібіры (пешшу, па заснежанай раўніне, якая, магчыма, існавала на месцы Берынгава заліва і злучала Азію з Паўночнай Амерыкай).

Качавыя паляўнічыя плямёны вандравалі тут у пошуках здабычы з 10--9 тыс да н.э., а іх нашчадкі ў перыяд 8 – 1,5 тыс. да н.э. ужо займаліся прымітыўным земляробствам.

Разнастайныя індзейскія плямёны, якія пражывалі на тэрыторыі сённяшніх Злучаных Штатаў, будавалі, як і беларусы, курганы, якія служылі разнастайным рэлігійным мэтам, а таксама стваралі анасазі – культавыя цэнтры даволі складанай інжынернай канструкцыі, пераважна з камянёў, часам у некалькі паверхаў са шматлікімі (у некалькі сотняў) пакоямі.

Індзейцы размаўлялі на розных мовах, мелі лад жыцця і цыклы актыўнасці ў залежнасці ад умоў пражывання. Як правіла, рассяляліся ўздоўж рэк, як і далёкія продкі беларусаў. Асноўнымі відамі дзейнасці выступалі паляванне, рыбная лоўля, земляробства і збіральніцтва. Існавала практыка сезоннай міграцыі, асабліва ў паўночна-ўсходніх раёнах.

Даволі складана даць абагуленую характарыстыку разнастайнай культуры індзейскіх плямёнаў. Аб’ядноўвалі іх дзве рэчы: выключна важнае роля абшчыны ў жыцці кожнага чалавека, а таксама велізарная роля рэлігіі з уласцівымі ёй політэізмам, пантэізмам, анімізмам.

Зрэшты, гэтыя асаблівасці былі характэрныя ці не для ўсіх старажытных плямёнаў, у тым ліку тых, якія пражывалі на тэрыторыі нашай краіны.

Амерыка пачала засяляцца еўрапейцамі толькі пачынаючы з XVI ст. Да самага пачатку XVII ст. у Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыцы практычна аднаасобна гаспадарыла Іспанія (калі не лічыць партугальскіх уладанняў у Бразіліі). Іспанцы і партугальцы пачалі ўвозіць чарнаскурых рабоў з Афрыкі, бо выкарыстанне індзейцаў у якасці працоўнай сілы аказалася малаэфектыўным: у рабстве індзейцы адразу гінулі, пераважна ў выніку

завезеных сюды еўрапейцамі хвароб, да якіх мясцовае насельніцтва не мела імунітэту. З XVI ст. Амерыку пачалі наведваць і французскія экспедыцыі, і ў 1608 г. імі быў заснаваны горад Квебек – першае пастаяннае французскае пасяленне, у канцы XVII ст. – рэгіён “Луізіяна”, а ў 1718 г. – горад Новы Арлеан. Французы ўсталявалі добрыя адносіны з індзейцамі, бо не прэтэндавалі на амерыканскую зямлю, а цікавіліся ў асноўным пушнінай, -- як, зрэшты, і галандцы, якія першымі заклалі гандлёвае пасяленне “Новы Амстэрдам”, пазней (у 1664 г.) захопленае англічанамі і перайменаванае ў Нью-Йорк.

Брытанская карона, маючы вопыт ірландскай “каланізацыі”, у канцы XVI ст. пачала выкарыстоўваць яго і на амерыканскім кантыненце: спачатку падпарадкоўваць сабе “дзікуноў”, а потым беспакарана прысвойваць іх землі. У пачатку XVII ст. брытанцы замацаваліся ў Паўночнай Амерыцы. Адбылося гэта не дзякуючы ваеннай моцы і цэнтралізаванаму кіраванню, а дзякуючы таму, што складае саму аснову амерыканскай дэмакратыі і што надзвычай цэніцца ў амерыканскай традыцыі, – *прыватнаму прадпрымальніцтву***.** Акцыянерная кампанія, заснаваная групай англійскіх бізнесменаў, арганізавала продаж зямельных участкаў, і інвестары ахвотна ўкладалі грошы ў надзеі атрымаць вялікія прыбыткі за кошт развіцця амерыканскага рынку. Арганізоўваліся калоніі, засноўваліся пасяленні. Праўда, англічане не знайшлі тут карысных выкапняў, затое пачалі вырошчваць тытунь і ўвогуле займацца земляробствам. З-за недахопу працоўнай сілы даводзілася прывозіць наёмных работнікаў (сервентаў), з якімі заключаліся кантракты.

*Знакамітае амерыканскае вынаходніцтва даказвае, што амерыканскія піянеры ўсё ж былі прадпрымальнымі людзьмі, а не нікчэмнымі ўцекачамі.*

У Амерыку прыбывалі разнастайныя рэлігійныя групы: каталікі, “пілігрымы”, квакеры, пурытане, прадстаўнікі англіканскай царквы, прэсвітэране, кангрэгацыяналісты, баптысты і інш., якія стваралі асобныя абшчыны і выпрацоўвалі ўласны сталь жыцця. Фарміраваўся добра знаёмы беларусам *поліканфесіяналізм.*

У канцы XVII ст. пачалі паўставаць буйнамаштабныя гаспадаркі, дзе ўсё шырэй выкарыстоўвалася рабская праца, прычым ад пачатку чарнаскурыя працаўнікі лічыліся вольнымі людзьмі. Восемдзесят працэнтаў нявольнікаў, якія прыбывалі ў заходняе паўшар’е, асядалі ў Вест-Індыі і Бразіліі, і толькі невялікая частка (да пяці працэнтаў) накіроўвалася ў будучыя Злучаныя Штаты. Рабства існавала ва ўсіх брытанскіх калоніях, але ў рознай ступені: самая высокая патрэба ў рабскай працы была на Поўдні.

Усё больш канфліктнымі станавіліся стасункі з індзейцамі, што вылілася ў ваенныя дзеянні, асабліва жорсткія ў 1675 і 1676 гадах.

Брытанскія каланісты паводзілі сябе як лаяльныя вернападданыя англійскай кароны і ўносілі значны ўклад у фінансавае развіццё і квітненне Брытанскай імперыі. Каланісты прывезлі з сабой нацыянальныя традыцыі, але, апынуўшыся на чужыне, былі вымушаны прыстасоўвацца да зусім іншых умоў: адбывалася актыўнае змяшанне брытанскіх прынцыпаў і амерыканскай практыкі. У амерыканскім грамадстве, напрыклад, адсутнічала жорстка структураваная іерархія, у адрозненне ад метраполіі, тут значна большая колькасць людзей мела выбарчае права.

Імкненне метраполіі атрымліваць як мага больш падаткаў з каланіяльных зямель, спробы навязаць свае правілы і абмежаванні прывялі ў рэшце рэшт да незадаволенасці амерыканцаў і іх імкнення любой цаной атрымаць эканамічную свабоду, што вылілася ў адкрытае ваеннае супрацьстаянне 1773 – 1775 гадоў.

Станавілася ўсё больш відавочным, што існавала ў Амерыцы нешта такое, – і гэта датычыла як высокіх сфераў духу, так і паўсядзённай рэчаіснасці, – што аддаляла ад былой радзімы. Вось як акрэсліў сутнасць амерыканца перасяленец з Францыі Мішэль-Гійём-Жан дэ Крэвекер, які пісаў у 1782 г.: “Ён [амерыканец – Л.У.] або еўрапеец, або нашчадак еўрапейцаў, і адсюль незвычайнае змяшанне рознай крыві, чаго вы не знойдзеце ў ніякай іншай краіне… Ён амерыканец – той, хто, развітаўшыся са сваімі ранейшымі звычкамі і забабонамі, набывае новыя, прадыктаваныя новым укладам жыцця, якое яго акаляе… Амерыканцы – заходнія пілігрымы, якія прынеслі з сабой велізарны багаж мастацтваў, навук, законаў і індустрыі, якія задоўга да таго зарадзіліся на ўсходзе; і яны завершаць гэтае вялікае кола”.

*Да канца XVIII ст. сфарміраваліся асноўныя асаблівасці нацыянальнага характару амерыканцаў: самадысцыпліна, сціпласць і працалюбства. З цягам часу паглыблялася разуменне небяспекі ўлады, якая непазбежна разбэшчвае кожнага, хто ёй валодае. Народ, каб захаваць свабоду (ад Брытанскай метраполіі), павінен быў рэалізаваць у жыцці традыцыйны набор “грамадзянскіх дабрачыннасцей”. Пры гэтым асобныя індывіды павінны ахвяраваць асабістымі інтарэсамі дзеля агульнага дабра. Досвед самакіравання павінен быў дапамагчы амерыканцам выключыць тыя формы самакіравання, якія нараджаюць карупцыю і тыранію. У выніку амерыканцы стварылі простыя палітычныя інстытуты і засведчылі сваю стойкую адданасць ідэалам дэмакратыі і свабоды. Амерыканскі народ патрабаваў такога ладу, дзе б квітнелі свабода, роўнасць і шырокая палітычная актыўнасць людзей.*

У вызваленчай барацьбе, якая расцягнулася на сем гадоў (1775 – 1781 гг.) амерыканцы атрымалі перамогу дзякуючы сваёй упартасці і ўменню

завесці праціўнікаў у тупік, хаця, безумоўна, перспектыва ўзнікнення ў Паўночнай Амерыцы магутнай рэспубліканскай дзяржавы з антыманархічнай і антыкаланіяльнай накіраванасцю мала радавала метраполію. На працягу 14 гадоў амерыканцы фарміравалі ўрады штатаў і рэарганізоўвалі іх; нейкі час жылі з часовым федэральным “урадам” , паспрабавалі іншае, расчараваліся і ўзяліся за фарміраванне трэцяга ўраду.

Важную ролю ў станаўленні амерыканскай свядомасці ў працэсе аддзялення калоній у 1775 г. адыграў памфлет Томаса Пейна “Здаровы сэнс”. У гэтым творы амерыканцы паказваліся як асобны народ з уласцівымі яму рысамі чыстага, несапсаванага характару, без еўрапейскай разбэшчанасці.

04 ліпеня 1776 г. была прынята Дэкларацыя незалежнасці, падрыхтаваная ў асноўным Томасам Джэферсонам, дзе афіцыйна абвяшчалася аддзяленне ад Брытаніі. (Канстытуцыя ЗША была прынята 17 верасня 1787 г., ратыфікавана ў 1788 і стала першай у свеце; другой стала канстытуцыя Польшчы, прынятая 03 мая 1791 г.). Дэкларацыя ўтрымлівала галоўныя прынцыпы жыццядзейнасці амерыканскага грамадства: першае палажэнне сцвярджала *роўнасць усіх людзей перад Богам*; далей гаварылася пра *чалавечыя правы*, закладзеныя ў самой натуры чалавека, а таксама пра ўладу, якую ўрад атрымлівае са згоды народа.

Такім чынам, атрымаўшы багаты вопыт супрацьстаяння з метраполіяй, амерыканцы аж да сённяшняга дня захоўваюць *інстынктыўны недавер да любой кіруючай улады*, а больш за ўсё на свеце яны па-ранейшаму цэняць *асабістую свабоду*, практыкуючы сумесь гуманізму і строгага кантролю.

Першы амерыканскі прэзідэнт Джордж Вашыгнтон (1789 – 1797 гг.), чалавек памяркоўны і асцярожны, добра ведаў традыцыйны недавер свайго народа да ўлады і не жадаў браць сабе занадта шырокія паўнамоцтвы: ён заўсёды глядзеў на сваё прэзідэнцтва перш за ўсё як на сведчанне народнага даверу, а толькі потым – як на прэрагатыву ўлады. “Біль аб правах”, які ў 1791 г. стаў часткай Канстытуцыі, яшчэ раз пацвердзіў, што дзяржаве забараняецца ўмешвацца ў думкі, погляды і перакананні сваіх грамадзян. І гэта паказальна і сімвалічна: адным з першых актаў новага ўраду стала абмежаванне ўласнай улады. Разумнае кіраванне Джорджа Вашынгтона, такім чынам, забяспечыла адабрэнне народам рэспубліканскай формы кіравання.

Адносіны да індзейцаў таксама паступова змяняліся. У першыя 80 гадоў існавання рэспублікі за індзейцамі афіцыйна прызнаваўся статус суверэнных народнасцей, але на практыцы гэты суверэнітэт, як правіла, спрытна абыходзіўся. Большасць белых амерыканцаў лічылі карэнных жыхароў непаўнацэннымі людзьмі – неразумнымі дзецьмі або ўвогуле дзікунамі. У 1831 г. Вярхоўны суд вызначыў карэннае насельніцтва як

“унутрана залежную нацыю”. Але сітуацыя не выглядала безнадзейнай: можна было “цывілізаваць” індзейцаў, каб тыя паступова адмовіліся ад традыцыйнага ладу жыцця і змаглі ўвайсці ў белую супольнасць. Быў і іншы шлях вырашэння праблемы індзейцаў – сепаратны, згодна з якім ад індзейцаў трэба адмежавацца фізічна, стварыўшы гвалтоўным чынам дыстанцыю паміж індзейцамі і белым насельніцтвам. А што рабіць, калі купка ўпартых дзікуноў, не здатных разумна распарадзіцца прыроднымі багаццямі, замінае патэнцыйнаму квітненню больш цывілізаванай нацыі? Дзейнічаў прынцып “адна раса знікае, каб вызваліць жыццёвую прастору для іншай”.

*Такім чынам, еўрапейская іміграцыя ў Амерыку ў першай палове XIX ст. па ўсіх параметрах была з’явай унікальнай. Шматлікія перасяленцы з Еўропы разам з індзейцамі, кітайцамі, іспанцамі (амерыканцы іх вылучаюць асобна),чарнаскурымі назаўсёды змянілі твар амерыканскага грамадства, стварыўшы “нацыю нацый” (глабалізм у мініяцюры).*

У XIX ст. усё яшчэ актыўна развіваўся інстытут рабства, які прыносіў велізарныя даходы рабаўладальнікам. У 1820 г. налічвалася паўтара мільёна нявольнікаў. Рабаўладальнікі былі зацікаўлены ў свабодным перамяшчэнні свайго “тавара” – так складваўся ўнутраны гандаль рабамі. У 1860 г. у паўднёвых штатах налічвалася ўжо больш за 12 млн. чалавек, з іх 8 млн. белых, 250 тыс. свабодных чарнаскурых і 4 млн. рабоў. Колькасць рабаўладальнікаў складала ўсяго каля 400 тыс. чалавек, г. зн.усяго каля 5% белага насельніцтва: каля 25% паўднёвых сямействаў трымалі чарнаскурых нявольнікаў. Астатнія белыя насельнікі былі свабоднымі фермерамі, якія сіламі сваіх сем’яў апрацоўвалі сціплыя зямельныя надзелы, вырошчвалі кукурузу і бульбу, гадавалі курэй і свіней. Сярэдні рабаўладальнік быў прыкладна ў 10 разоў багацейшы за свайго суседа – нерабаўладальніка.

Здавалася б, фермеры не мелі ніякага дачынення да рабства. Аднак сама сістэма рабства стала важнейшым фактарам жыцця ў паўднёвых штатах, які вызначаў тып грамадскіх адносін, а таксама стыль мыслення, набор каштоўнасцей і паводзін людзей у цэлым.

Традыцыйна ў паўднёвых штатах склалася каставае грамадства, у якім колер скуры вызначаў сацыяльны ранг чалавека. *Канцэпцыя “свабоды”, як гэта ні парадаксальна, звязвалася тут з рабаўладаннем: асноўнай праявай свабоды плантатары лічылі права мець рабоў і права ўсялякага выбару ў гэтым “мясцовым” пытанні.*

Паўднёвыя штаты аніяк не хацелі падзяляць пазіцыю Джэферсона, які разглядаў рабства як часова існуючае, але “непазбежнае зло”. Прыводзіліся аргументы на карысць інстытута рабства: маўляў, Біблія нідзе не выказваецца супраць рабства; нібыта існуе прыродная, першапачатковая няроўнасць

чарнаскурых і белых; інстытуты рабства, маўляў, існавалі яшчэ ў Старажытнай Грэцыі і Старажытным Рыме; белая раса аказала неацэнную паслугу чорным рабам, вырваўшы тых з дзікунства і невуцтва.

З-за свайго асаблівага ладу жыцця Поўдзень паступова ізаляваўся. Увогуле ж рабства, якое прыносіла вялікія прыбыткі асобным людзям, у цэлым аказвала негатыўны ўплыў на доўгачасовае развіццё рэгіёна. Глеба збяднялася, прамысловасць не развівалася, урбанізацыя ў параўнанні з Поўначчу была значна больш адсталай. Фактычна Поўдзень апынуўся ў каланіяльнай залежнасці ад больш развітых рэгіёнаў.

Паўночныя рэгіёны, хаця і цярпелі інстытут рабства на Поўдні, занялі катэгарычна непрымірымую пазіцыю, што датычыла распаўсюджвання рабства на Захад і Поўнач: новыя неабжытыя землі на захадзе прызначаліся толькі для свабодных працаўнікоў!

Самі чарнаскурыя нявольнікі рэдка адважваліся на адкрытыя паўстанні, што тлумачылася хутчэй простым здаровым сэнсам, чым пасіўнасцю: шанцаў на перамогу амаль не было. Аднак паціху-памалу рабы шукалі спосабаў сцвердзіць сваю каштоўнасць і значнасць, прысвойваючы сабе пэўную меру кантролю над умовамі ўласнага існавання.

Наспяваў канфлікт. Рух за адмену рабства ў сярэдзіне XIX ст. аб’яднаў у сваіх шэрагах ужо амаль чвэрць мільёна жыхароў паўночных штатаў (абаліцыяністаў).

Увогуле ж да сярэдзіны XIX ст. амерыканская нацыя перажыла цэлы шэраг крызісаў, кожны з якіх станавіўся ўсё больш небяспечным. Нацыя раскалолася на два варожыя лагеры. Прычынай таму стала праблема ўзмацнення рабства ў краіне, якая мацнела з кожным днём.

Чалавекам, які дамогся афіцыйнай адмены рабства і аб’яднаў нацыю, стаў Абраам Лінкольн.

## 3. “Ні валадароў, ні рабоў…” Абраам Лінкольн: беларусам на роздум.

Амерыка як маладая краіна, зямля пасіянарыяў багатая на яркія асобы – як цяпер, так і ў мінулым. Кожны з яе прэзідэнтаў варты асаблівай увагі і ўсялякай пашаны як нацыянальны герой. Мне, аднак, найбольш імпануе постаць Абраама Лінкольна – аднаго з самых цікавых амерыканскіх прэзідэнтаў, які валодаў сапраўднай харызмай, быў адданы справе і умеў аб’яднаць вакол сябе людзей.

Нашчадак першых амерыканскіх пасяленцаў, сын фермера Абраам Лінкольн (1809 – 1865 гг.) пражыў нядоўгае, але надзвычай яркае жыццё і стаў легендай, міфам краіны. Праніклівы розум, глыбокая жыццёвая і

дзяржаўная мудрасць, сумленнасць, непадкупнасць, добразычлівасць і цярпімасць дазволілі яму ў 1860 г. стаць шаснаццатым прэзідэнтам ЗША.

Беднасць Абраама, яго цяжкае дзяцінства, выключная сціпласць спалучаліся з вялікай патрабавальнасцю да сябе, высокімі маральнымі прынцыпамі, абыякавасцю да ўсялякага знешняга бляску і пратакольных умоўнасцей. Вернасць і чалавекалюбства – вось асноўныя рысы Абраама. Верны сябар, верны муж, верны сваім перакананням патрыёт, верны Богу чалавек. Абраама заўсёды вызначалі ўнутраная сіла і знешні спакой, гатоўнасць да канца адстойваць свае ідэалы і адначасова – пакора непазбежнаму лёсу.

А.Лінкольн з дзяцінства меў велізарную цягу да ведаў, хаця да 15 гадоў не трымаў у руках алоўка. Пэўны час служыў пісарам у сельскай краме. Усё жыццё яму не шанцавала, пазней не меў поспехаў і ў бізнесе, аднак самавукам здолеў стаць добрым юрыстам.

Непрыгожы знешне, ён здзіўляў сваёй унутранай красою і духоўнай моцай. Народжаны бацькамі, якія толькі і маглі, што прывіць яму веру ў справядлівасць і чалавечую годнасць, ён стаў тым, кім стаў, дзякуючы праверцы беднасцю і працай.

Увогуле нельга не захапляцца чалавекам, які пачаў падымацца з самага дна, быў нікім і нічым, такім непрыгожым, што, здавалася, ніводная з жанчын не здолее пакахаць яго. Выглядала, што меланхолія Абраама народжаная яго адзінотаю. Самае лепшае, што арыстакратычная эліта магла зрабіць для яго, – гэта пакінуць у спакоі. Поўная адсутнасць знешняй саліднасці, вальяжнасці Абраама спалучаліся з поўнай адсутнасцю якіх-кольвечы прыкметаў дамскага ўгодніка. Не быў славалюбівым. Абыякавы да матэрыяльнай часткі жыцця, жыў надзвычай сціпла, не імкнуўся да кантактаў з патрэбнымі людзьмі, не ведаў, як трымаць сябе, каб атрымліваць ганарары, законна ім заробленыя.

Валодаючы іскрамётным пачуццём гумару,  Абраам часта выбіраў сабе ролю жартаўніка. І многія сучаснікі параўновалі яго з грубым, неадшліфаваным алмазам.

Пра складаны жыццёвы лёс Абраама Лінкольна, асабліва ж пра каханне Абраама і яго шлюб з Мэры Тод таленавіта расказаў у сваім рамане “Каханне вечнае” амерыканскі пісьменнік Ірвінг Стоўн, якому ў бліскучай мастацкай манеры ўдалося спалучыць гістарычную праўдзівасць з раскрыццём унутранага свету герояў.

Вось як апісвае пісьменнік першую сустрэчу Мэры і Лінкольна: “…Падалося, што яна [Мэры – Л.У.] губляе розум: з люка на столі над трыбунай паказалася пара ног, затым голыя ікры. Доўгія ногі працягвалі спускацца і, здавалася, працягнуліся на цэлых тры метры ад люка на столі да трыбуны. Пакуль яна знаходзілася ў шоку, з’явілася астатняя частка мужчыны: доўгі

сухі торс і шыя, рукі, яшчэ даўжэйшыя, чым неверагодна доўгія ногі, цёмны худы твар з выступаючымі скуламі і ўскалмачаная цёмная шэвелюра.” Гэты няўклюдны чалавек спусціўся ў пакой, каб заступіцца за таго, каго зганялі з трыбуны: “Спыніцеся, джэнтльмены. Гэта краіна свабоды слова. Бейкер мае права гаварыць, і, калі вы прагоніце яго з трыбуны, вы павінны прагнаць і мяне”. У яго ўладным голасе не было гневу, нават намёка на пагрозу, аднак прысутныя ўсвядомілі, што зрушыць такога гіганта немагчыма.

Гэтая сцэна – сімвалічная. Выключная ўнутраная моц і ўнутраны спакой, бясконцая адданасць сваім перакананням былі самымі надзейнымі спадарожнікамі Абраама Лінкольна, якія заўсёды служылі яму добрую службу і надзвычай спрыялі перамозе нават у самых безнадзейных сітуацыях.

Звыклая да шыкоўнага жыцця на багатым Поўдні, Мэры здолела дзеля кахання да мужа прыняць яго глыбокую адданасць ідэям роўнасці, свабоды і справядлівасці. У Лінкольна было чацвёра сыноў: двое памерлі яшчэ ў дзяцінстве, трэці – пасля забойства Абраама, а апошні, Роберт, учыніў працэс над маці, у выніку якога Мэры трапіла ў дом для псіхічна хворых.

Асабістыя няшчасці сям’і Лінкольн шматкроць узмацняліся тым, што прыход Абраама ў Белы дом (прысягу на прэзідэнцтва Абраам Лінкольн прыняў 04 сакавіка 1861 г.) супаў з перыядам Грамадзянскай вайны 1861 – 1865 гадоў, выклiканай барацьбой сістэмы рабства (Поўдзень) і сістэмы наёмнай працы (Поўнач). Повадам для развязвання вайны з боку рабаўладальніцкага Поўдня з’явілася якраз выбранне прэзідэнтам праціўніка рабства, рэспубліканца Абраама Лінкольна.

Абраам Лінкольн бязмежна верыў у ідэі дэмакратыі, у роўнасць людзей, іх натуральнае права на жыццё і свабоду. Менавіта яму належыць формула “Урад з народу, воляй народу і дзеля народу” (прыблізна ў той жа час Кастусь Каліноўскі прамаўляе свае знакамітыя словы, што “не народ для ўрада, а ўрад для народа”).

Абраам Лінкольн змагаўся за адзінства краіны, якое было неабходнай умовай знішчэння рабства. Абраам шмат разоў задаваў рытарычнае пытанне, ці можа яго краіна жыць напалову рабскай, напалову вольнай. І нязменна паўтараў, што *распаўсюджванне рабства ёсць злачынствам супраць Бога і чалавека. Рабства пераварочвае натуральны ход рэчаў і пераўтварае ілжывасць у неабходную дабрачыннасць.*

“Мы даказалі сваю фізічную сілу, яе недастаткова, цяпер мы павінны ўвесці ў дзеянне нашу духоўную моц.” Адкрытасць, смеласць, адважнасць – рэчы, несумяшчальныя з рабствам: “Прыйшоў час выказаць свае пачуцці, і, калі я палячу галавой уніз на зямлю з-за гэтай прамовы, тады прынамсі я буду падаць з тым, што справядлівае і праўдзівае” [с. 287].

Абраам быў выключна мужным чалавекам, сапраўдным мужчынам. Усё жыццё імкнуўся да самаўдасканалення, развіцця. Некаторыя свае ўчынкі, як, напрыклад, ананімныя артыкулы ў газетах, дзе высмейваў і крытыкаваў сваіх палітычных апанентаў, з часам адкрыта прызнаваў памылковымі і знаходзіў у сабе сілы змяняцца.

Цягам усёй сваёй грамадска-палітычнай актыўнасці Абраам Лінкольн дэманстраваў стратэгічныя, дзяржаўныя падыходы, а таксама глыбокі, сапраўдны патрыятызм, накіраваны на захаванне цэласнай нацыі і дзяржавы.

У Абраама было шмат папярэднікаў і аднадумцаў. Яшчэ ў 1829 г. выйшаў у свет “Зварот” Дэвіда Уокера, які заклікаў да адмены рабства. Да сярэдзіны XIX стагоддзя ўжо многія свабодалюбівыя людзі Амерыкі пачалі выказваць думку, што афіцыйныя ўлады робяць усё магчымае для захавання і квітнення рабства. У такіх умовах, як палічыў, напрыклад, звычайны грамадзянін Джоўн Браўн, было б справядлівым  абаперціся на ўласныя сілы і выкараніць грэх рабства, а таксама аднавіць свабоду ў Амерыцы. Джон Браўн планаваў арганізаваць узброенае паўстанне рабоў ва ўсіх паўднёвых штатах, але ў 1859 г. быў захоплены і пакараны смерцю як мяцежнік і загаворшчык. У чаканні смяротнай гадзіны Джон Браўн пісаў з турэмнай камеры: “Я, Джон Браўн, і зараз абсалютна перакананы ў вінаватасці гэтай злачыннай зямлі, і віну гэтую можна змыць толькі крывёю”.

Паўночныя штаты ўсяляк спачувалі Браўну і яго высокім гуманным прынцыпам. Адначасна паўднёвыя штаты лічылі яго злачынцам і вар’ятам, які збіраўся разбурыць саму жыццёвую аснову Поўдня.

Рабства ( а таксама эканамічная і сацыяльная розніца паўночных і паўднёвых штатаў, а пазней і сепаратызм) рэзка падзяліла Амерыку. Выглядала, што краіна расколатая на дзве нацыі, якія нічога супольнага не мелі між сабой.

Увогуле на працягу дзесяцігоддзяў паўднёвыя штаты бачылі толькі адзін шлях захаваць усё так, як ёсць, – адлучыцца ад Саюза. У канцы 1860 г. Паўднёвая Караліна ажыццявіла сваю пагрозу, аб’явіўшы аб разрыве з астатнімі штатамі. На працягу пары месяцаў да Паўднёвай Караліны далучыліся яшчэ шэсць штатаў, утварыўшы Канфедэратыўныя Штаты Амерыкі, ці Канфедэрацыю, а пазней – яшчэ чатыры. Не паспеўшы пакуль пакінуць пост прэзідэнта, Бьюкенен абвясціў адлучэнне незаконным. Прыняўшы прысягу прэзідэнта 04 сакавіка 1861 г., Абраам Лінкольн пачаў рабіць усё магчымае для мірнага ўрэгулявання канфлікту, але грамадзянская вайна, тым не менш, усё ж пачалася. Поўдзень называў гэтую вайну “вайной штатаў”,  Поўнач – “вайной супраць мяцежнікаў”.

*Вайна паказала тую прорву, якая ўтварылася паміж амерыканцамі ў пытаннях свабоды і статусу нацыі. Яна стала трагічным адкрыццём новай Амерыкі, якая паступова мусіла зразумець важнасць адзінства.*

Грамадзянская вайна была крывавай, жорсткай. Змагаліся сем'і з сем'ямі, змагаліся ў сем'ях: брат з сястрою, сын з бацькам. Трагедыя закранула ўсіх. Поўнач і прэзідэнт (Абраам Лінкольн) цярпелі паразу за паразай, вера і надзея на перамогу станавіліся ўсё слабейшымі, здавалася, усё было супраць адзінства Саюза і яго прэзідэнта. І калі нават учарашнія прыхільнікі палітыкі Абраама Лінкольна пераставалі верыць у магчымасць перамогі і мэтазгоднасць вайны, прэзідэнт працягваў глыбока верыць у правільнасць абранага шляху: няхай паражэнне, смерць асабістая і смерць любімай сям'і, але нельга адступаць ад галоўнай ідэі – цэласнасці краіны і свабоды ад рабства. Канстытуцыйныя прынцыпы, захаванне законнасці і сама будучая веліч Амерыкі – усё гэта, на думку А.Лінкольна, было магчымым толькі ва ўмовах захавання Саюза. Гэтая ідэя была для прэзідэнта святой, тут адмаўляліся ўсялякія кампрамісы. Разам з тым, Лінкольн заўжды рабіў стаўку на палітыку паблажлівасці і прымірэння, на павагу да пачуццяў апанентаў.

Абраам Лінкольн нават у вачах сваіх прыхільнікаў выглядаў некампетэнтным навічком, без належнага ваеннага вопыту на фоне мноства ўласных палітычных няўдач: невыпадкова ў разгар грамадзянскай вайны, калі ў 1862 годзе праводзіліся выбары ў Кангрэс, выбаршчыкі выказалі нязгоду з палітыкай Лінкольна. Аднак прэзідэнт у сваёй характэрнай сціплай, трохі адчужанай, але настойлівай манеры здолеў з карысцю для справы выкарыстаць усе абставіны – як спрыяльныя, так і зусім наадварот. Так, у 1862 г. Лінкольн абвясціў знакамітую Папярэднюю пракламацыю вызвалення, згодна з якой усе рабы аб'яўляліся свабоднымі – "цяпер і навекі". Калі да верасня 1862 г. Поўнач вяла вайну з мэтай аднавіць адзінства дзяржавы, то пасля Пракламацыі – яшчэ і за свабоду.

Больш за 600 тыс. амерыканцаў аддалі свае жыцці, каб спыніць бясконцыя спрэчкі па пытаннях статусу сваёй дзяржавы і сутнасці дэмакратыі. Яны шчыра верылі, што менавіта пры іх удзеле вырашаецца лёс свабоды, хаця часта зусім па-рознаму разумелі сэнс свабоды і тых ідэалаў, якія іх продкі сфармулявалі яшчэ ў 1776 годзе.

У лісце-звароце да амерыканскага народа, дзе трэба было патлумачыць мэты вайны, Абраам пісаў:

"Чатыры разы па дваццаць і сем гадоў таму назад нашыя бацькі заснавалі на гэтым кантыненце новую дзяржаву, запачаткаваную ў лоне свабоды з глыбокай верай у тое, што "ўсе людзі створаныя роўнымі".

Зараз мы вядзем вялікую грамадзянскую вайну, якая падвяргае выпрабаванню, ці можа ўтрымацца такая дзяржава ці любая дзяржава, такім чынам запачаткаваная і адданая тым самым ідэалам. Мы сабраліся на полі буйнейшага змагання гэтай вайны. Мы прыйшлі сюды, каб асвяціць частку гэтага поля як месца апошняга заспакаення тых, хто памёр тут, каб дзяржава магла жыць. Без усялякага сумнення, гэтым мы выконваем свой абавязак. Але ў больш шырокім сэнсе мы не ў стане ані асвяціць, ані праславіць гэтую зямлю, ані зрабіць яе вартай пакланення. Адважныя людзі, жывыя і мёртвыя, якія змагаліся тут, ужо асвяцілі яе, і не ў нашых слабых сілах павялічыць ці зменшыць веліч створанага імі. Наўрад ці свет надасць вялікае значэнне і будзе доўга памятаць сказанае намі тут, але ён ніколі не забудзе, што зрабілі яны, гэтыя людзі.

Хутчэй нам, хто жыве, варта прысвяціць сябе велічнай задачы, якая стаіць перад намі, – натхніцца прыкладам гэтых высакародных загінулых і напоўніцца высокай адданасцю той справе, якой яны заставаліся вернымі да канца, – вырашыць, што гэтыя людзі загінулі тут не дарэмна; што дзяржава даб’ецца новага адраджэння свабоды і ўрад з народа, воляй народа і для народа не знікне з твару зямлі”.

Злучаныя Штаты Амерыкі як цэласная дзяржава былі выратаваныя. Аднак спатрэбілася яшчэ адна ахвяра: 14 красавіка 1865 г. Абраам Лінкольн быў ранены ў тэатры Форда і на наступны дзень памёр, завяршыўшы сваёй смерцю самую жахлівую і катастрафічную вайну за ўсю гісторыю рэспублікі.

*Вось, свабода ў Злучаных Штатах атрымала перамогу. У жорсткай, бязлітаснай барацьбе. На зямлі, якая спазнала і ўвабрала столькі няроўнасці і здзеку, сярод якіх перш за ўсё беспрэцэдэнтныя праявы расізму з яго гандлем і жорсткай эксплуатацыяй чарнаскурых рабоў, дыскрымінацыйным адсяленнем і знішчэннем мясцовага індзейскага насельніцтва. Ёсць нешта сімвалічнае і заканамернае ў тым, што ідэалы свабоды заззялі найярчэй менавіта там, дзе панавала рабская няволя. Золата ачышчаецца агнём.*

*Нам, беларусам, належыць многае пераняць і многаму павучыцца ў Абраама Лінкольна.*

*Перш за ўсё, веры ў Бога, веры ў свае сілы і ў свой народ, веры ў перамогу, веры ў ідэалы.*

*На жаль, штучнае і трагічнае адлучэнне нашага народа ад хрысціянскіх традыцый і ўвогуле сістэмнае знішчэнне веры ў Бога, уся бальшавіцкая сістэма ваяўнічага атэізму і матэрыялізму поруч з няўключанасцю масавага этнічнага беларуса ў кантэкст нацыянальнай культуры з яе ідэаламі і каштоўнасцямі этычнага, эстэтычнага і інш. планаў, сучасныя працэсы засілля масавай эрзац-культуры, глабальнае насаджэнне распадных стэрэатыпаў паводзін, крызіс хрысціянства ў*

*Еўропе і шэраг іншых фактараў паставілі наш народ на мяжу маральнай дэградацыі і сацыяльнага распаду. Веры, арыентацыі на духоўныя ідэалы беларусам бракуе. Адсюль бракуе і адданасці агульнанацыянальнай справе і мэтанакіраванай, да пошняга, працы на карысць яе. Арыентацыя толькі на кароткачасовую выгаду, матэрыяльны, знешні інтарэс, імкненне да карысці толькі і выключна для сябе, нейкая дробязная мышыная валтузня не садзейнічаюць агульнанацыянальнай салідарнасці і грамадскай еднасці. Як быццам бы можна шчасліва ўладкавацца ў неўладкаванай краіне!*

*Думаецца, што многія нашы праблемы з адсутнасцю нацыянальнай салідарнасці (о, гэтае пекла зайздрасці, вузкалобае жаданне не прызнаць і не дапусціць поспеху іншага, замаўчаць і затаптаць усё неардынарнае і таленавітае!; пра вартасць і прагрэсіўнасць нейкага пачынання можна меркаваць па інтэнсіўнасці раўнівай і злоснай крытыкі) маюць пачатак перш за ўсё ў маральным разлажэнні, якое і стаецца магчымым у выпадку браку веры.*

*Безадказнасць, “вузкашкурны” інтарэс, прыстасавальніцтва, дробязнасць у самым непрыглядным абліччы асабліва кідаюцца ў вочы ў сітуацыі з нацыянальнай мовай. Усё часцей значная частка “эліты” не паслугуецца ёю не з увагі на адсутнасць заканадаўчай падтрымкі, а з увагі на адсутнасць асабістай і нацыянальнай годнасці. Зрэшты, калі няма асабістай годнасці, пра якую годнасць народа можна гаварыць?*

*Няма дабрачыннасці без свабоды, але і свабоды – без дабрачыннасці. Як у зачараваным коле, ніякія змены да лепшага немагчымыя без зменаў у светапоглядзе. Рабская псіхалогія, сервілізм – гэтыя праявы супраць Бога і чалавека – ляжаць у аснове шырока распаўсюджаных сёння падхалімажу, прыстасавальніцтва, дробнай і буйнай карупцыі і карупцыйных паводзін, відавочнага браку чалавечай мужнасці і элементарнай мужчынскасці, адкрытасці, сумленнасці і здаўна ўласцівай беларускай шляхце (як і кожнай іншай) высакароднасці. Савецка-азіяцкі менталітэт выяўляецца паўсюль, ад, здавалася б, бяскрыўднай сістэмы “вясельных генералаў”, да стылю дзейнасці некаторых “грамадскіх” структур з ярка выяўленым “сіндромам начальніка” (чаго ў грамадскіх арганізацыях у прынцыпе быць не павінна!) і непавагай да каштоўнасцей дэмакратыі і асобы чалавека. Чужы нам менталітэт належыць змяніць на беларускі, які заўжды быў еўрапейскім у самым лепшым значэнні гэтага слова.*

*Некалькі стагоддзяў, цягам якіх беларусы жылі ў Вялікім Княстве Літоўскім, не прайшлі, аднак, для нас дарэмна. Павага да права, імкненне да вяршэнства закона ў нас, беларусаў, у крыві. І праяўляецца гэта па-рознаму ў самых розных сітуацыях, – на жаль, усё часцей у якасці выключэння.*

*Чалавек заўсёды быў незадаволены сабой і навакольным светам, таму вядомая прытча пра філосафа, які днём з агнём шукае чалавека, актуальная ва ўсе часы. Але знаходзіўся філосаф, які шукае. І напэўна знаходзіўся чалавек, які свяціў. Хай жа і ў нас, беларусаў, і для нас, беларусаў, знойдуцца такія людзі, як Абраам Лінкольн, – які сам свяціў і шукаў тых, хто свеціць.*

## 4. Нацыянальная цэласнасць і стратэгія: беларускае адступленне

Абраам Лінкольн лічыў нацыянальную цэласнасць выключна важнай. Фактычна гэта была яго асноўная ідэя і галоўны прынцып усёй дзейнасці. Паўтара стагоддзя таму для амерыканскага прэзідэнта цэласная, непадзеленая нацыя была ідавочнай галоўнай падставай вырашэння любых іншых нацыянальных пытанняў. Надзвычай актуальным гэтае пытанне застаецца і для нас.

Сёння беларускае грамадства рэзка падзеленае як мінімум на дзве паловы. Пункт гледжання, згодна з якім сучасная беларуская нацыя размежаваная на левых, юніяністаў, якія за саюз з Расіяй, і для якіх нібыта нацыянальныя пытанні зводзяцца да сацыяльных, і рэспубліканцаў, якія за еўрапеізацыю, выклікае сумненні па той простай прычыне, што і правыя, і левыя ў беларускім грамадстве магчымыя толькі таму, што ёсць гэтае беларускае – нацыянальнае, на якім верхнім, эмпірычным пластом і існуе сучаснае грамадства. Насамрэч сучаснае грамадства ў Беларусі дзеліцца на тых, хто будуе беларускую нацыю, і тых, хто яе (наўмысна або па няведанні) руйнуе.

Застаючыся краінай пераходнай, транзітнай, з не вызначанымі прыярытэтамі, краінай праблемнай, якая вельмі залежыць ад вонкавага свету і які, аднак жа, не можа кардынальна паўплываць на ўнутраную беларускую сітуацыю, Беларусь, як любая іншая краіна, не можа існаваць без грамадскага кансенсусу па вызначальных, стратэгічных пытаннях.

Ігнараванне паняцця нацыі і звядзенне яго да паняцця грамадства – з’ява досыць пашыраная: “інжынеры новага грамадства” не бачаць у нацыі экзістэнцыяльнай, духоўнай, культурнай каштоўнасці, якая вызначаецца толькі ёй уласцівым сэнсам і адмысловасцю, бо здатныя разгледзець выключна “сацыяльныя элементы”, грамадскія рухі, палітычныя сілы. Як вынік, услед за нацыяй адкідваюцца і такія каштоўнасці, як сама айчына, традыцыя, родная мова (безумоўна, і вера, і духоўнасць, і сам Бог). Замест нацыі ўзнікае “грамадзянская супольнасць” як феномен рухомы, матэрыяльны, безасабовы, які лёгка паддаецца кіраванню сродкамі масавай інфармацыі і грашыма.

З гэтага пункту гледжання часам і даецца характарыстыка беларускага грамадства як нібыта нейкай сучаснай нацыі, што будуецца ў эпоху дэмакратызму, – пры адсутнасці беларускай буржуазіі, беларускага горада і беларускай шляхты. Такое грамадства – спажывецкае, прагматычна-ўтылітарнае, яно не мае гістарычнай памяці (гісторыя ўслаўляецца і прапагандуецца, пачынаючы з Другой Сусветнай вайны), не цэніць культурныя традыцыі і ў кожны момант гатовае павярнуць свае прыярытэты і вектары ў той бок, дзе прапануецца больш матэрыяльных выгод.

Аднак грамадства, якое не абапіраецца на нацыянальныя ідэалы, культурныя традыцыі і гістарычную памяць (пры тым, што беларуская нацыя валодае ўсімі гэтымі каштоўнасцямі), існуе без духоўнай апоры, патрыятычнай волі – неканкурэнтаздольнае і не мае якой-небудзь сур’ёзнай уласнай суб’ектнасці і тым больш – геапалітычнай перспектывы.

Такое грамадства не здатнае дасягнуць ажыццяўлення асноўных умоў і выяў дэмакратычнасці: палітычнага плюралізму, вольных выбараў, трыпадзелу ўлады, удзелу шырокіх мас у кіраванні, правоў чалавека, свабоды слова, прызнання найвышэйшай вартасцю ў соцыуме самога чалавека.

У маральнай і геапалітычнай плоскасці рэалізуецца не грамадства, а нацыя. Нацыя ставіць сабе мэты, выбірае каштоўнасці, да якіх звяртаецца сама і на якія арыентуе наступныя пакаленні, бо яна мае свае святыні, свае ідэалы і свае абавязкі.

Расколатае і раз’яднанае грамадства можа быць аб’яднанае на аснове фундаментальных агульнанацыянальных каштоўнасцей, якія мусяць выступаць прыярытэтамі беларускай стратэгіі. Маюцца на ўвазе перш за ўсё *беларуская нацыянальная культура ў самым шырокім яе сэнсе, нацыянальная (беларуская) мова, нацыянальная ідэнтычнасць* і асабліва актуальны ў сучасным свеце *міжкультурны дыялог*. Гэта тыя ідэі і прынцыпы, дзе кампрамісы не дапускаюцца, і дзе няма і не можа быць ніякай адмысловай мадэлі і ніякай адмысловай стратэгіі, бо азбучныя ісціны даўно выпрацаваныя і апрабаваныя ў свеце – народамі блізкімі і далёкімі. З’яднаўшыся на нацыянальным грунце, вырашыўшы фундаментальныя асновы нацыянальнага быцця, Беларусь здолее дакладна акрэсліць і рэалізаваць нацыянальны інтарэс і нацыянальную палітыку.

З гэтага пункту гледжання амерыканская нацыя часоў Абраама Лінкольна таксама мела надзвычай высокую патрэбу ў аб’яднанні і яднанні. І гэтаксама патрабавалася вызваліцца ад рабства, каб захаваць цэласнасць народа. Бо тое, што часам выглядае як сямейная спрэчка, якая можа быць улагоджаная без сур’ёзнай шкоды для бакоў, можа скончыцца знішчэннем пад корань усяго беларускага.

У адрозненне ад амерыканскай нацыі часоў Лінкольна, якая фарміравалася на аснове кшталтавання палітычных, грамадзянскіх інстытуцый і аб’ядноўвала, як відаць вышэй, самыя разнастайныя іміграцыйныя групы з уласцівымі ім духоўна-культурнымі каштоўнасцямі, беларускі народ ёсць аўтахтонным, спрадвечным на сваёй уласнай зямлі, ён выпрацаваў сваё этнічнае светаадчуванне і нацыянальны светапогляд у гармоніі з гэтай зямлёю (вядомая формула Косма-Псіха-Логасу). Менавіта таму духоўна-культурная складковая гэтак важная для беларускага нацыянальнага развіцця.

Тут варта спыніцца падрабязней на некалькіх важных пытаннях.

**Няма Беларусі без беларускай мовы.**

Існаванне народа па-за сваім светапоглядам (які выяўляецца мовай і ў мове), светаадчуваннем і светатварэннем немагчымае. Так як мова — знакава-сімвальнае, духоўнае аблічча ўсёй культуры, нацыі, нацыянальнай гісторыі, то па-за нацыянальнай мовай не можа нармальна развівацца і функцыянаваць не толькі культура, але і чалавек, грамадства, дзяржава. Менавіта таму беларуская мова мусіць быць пануючай у Беларусі.

*Увогуле ж ёсць пазіцыі, якія не падлягаюць дыскусіі і на дэбаты пра якія даўно пара накласці вета. Такой пазіцыяй выступае нацыянальная мова.*

Як лічаць шматлікія сучасныя сацыялінгвісты і сведчаць грамадскія практыкі, ураўнаважаны, рэальны білінгвізм доўга не існуе, заўсёды адна з моў з’яўляецца больш прыярытэтнай і выцясняе іншую мову ў сферу неафіцыйнай прыватнай камунікацыі аж да поўнага занікнення апошняй [1].

Беларуская мова – гэта далёка не толькі “матчына мова”, гэта аснова нацыянальнай свабоды, разам з нацыянальнай дзяржавай яна рэалізуе жыццёвы патэнцыял народа, духоўна-культурнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё, саму нацыянальную ідэю (падрабязней пра гэта – у брашуры “Як захаваць культурную сабытнасць?”).

Адкідванне ідэі дамінавання беларускай мовы як сутнаснай, іманентнай уласцівасці беларускага народа, замоўчванне і ігнараванне яе сведчыць не толькі пра неразуменне асноў быцця народа, але, магчыма, і пра свядомую антыбеларускую пазіцыю, накіраваную на вынішчэнне цэлага народа (у тым ліку і праз формы паўтарэння і незасваення адных і тых жа відавочных ісцін цягам цэлых стагоддзяў) як самастойнага суб’екта.

Адказнасць за моўную сітуацыю і, такім чынам, нацыянальную перспектыву, нясе не толькі дзяржава, але і грамадства, у першую чаргу інтэлектуальная і культурная эліта. На жаль, усё часцей даводзіцца сутыкацца з сітуацыяй, калі беларускія інтэлектуалы, творцы, грамадскія дзеячы, якія досыць добра валодаюць нацыянальнай мовай і актыўна паслугаваліся ёю

яшчэ колькі гадоў таму, адмаўляюцца ад яе на карысць расійскай не толькі ў прыватным жыцці, у сем‘ях, але і ў сваіх публічных выступленнях, а таксама ў прафесійнай дзейнасці. Так выяўляецца нацыянальная няспеласць, брак адказнасці (надзвычай пашыраная з’ява ў цэлым абязбожанага і бездухоўнага грамадства), адсутнасць належнай нацыянальнай свядомасці і як вынік – негатоўнасць (асабістая, грамадская, грамадзянская, якая заўгодна) выступаць у якасці суб’ектаў нацыятварэння.

Што трэба рабіць? Усім, хто можа, належыць ствараць тэксты (мастацкія, навуковыя, публіцыстычныя і інш.) па-беларуску, гаварыць і пісаць па-беларуску, пры гэтым актыўней вывучаць замежныя мовы і імкнуцца ведаць усё, што робіцца ў свеце.

**Беларуская нацыянальная культура з’яўляецца фундаментам дзяржаўнага суверэнітэту і незалежнасці Беларусі – першай умовы дэмакратызацыі грамадства.**

Дэмакратызацыя беларускага грамадства ёсць праектам утапічным і неажыццяўляльным без пабудовы незалежнай суверэннай дзяржавы, якая, у сваю чаргу, павінна мець сваім падмуркам нацыянальную культуру [2].

Беларусам па-ранейшаму надзвычай важна захаваць (набыць?) духоўна-культурную самастойнасць: залежнасць ад імперскай парадыгмы ўсё яшчэ выключна моцная (асабліва ў сацыяльна-гуманітарнай навуцы) і цяпер яна набывае тэндэнцыю да ўзмацнення – асноўнымі крыніцамі і аўтарытэтамі выступаюць расійскія аўтары, расійскі светапогляд (у тым ліку і праз расійскую мову), расійскія трактоўкі. Пры такіх падыходах беларуская традыцыя – еўрапейская, у многім шляхецкая і адначасова дэмакратычная, – не толькі не развіваецца, але затушоўваецца, замяшчаецца і знішчаецца.

З іншага боку, станавіцца ў пазіцыю прыкладных вучняў у адносінах да сучаснай заходнееўрапейскай культуры таксама не выпадае: рэалізуючы ўласны духоўна-культурны патэнцыял, неабходна ўлічваць фазавасць развіцця культур і грамадстваў – паўсюль ёсць перыяды і праявы росту, росквіту, а ёсць перыяды і праявы ўпадку і дэградацыі.

Увогуле ж беларуская нацыянальная культура знаходзіцца сёння ў стане глыбокага крызісу. Гэты крызіс абумоўлены не толькі ўласна нацыянальнымі праблемамі, але і крызіснымі з’явамі ў еўрапейскай (заходняй) сацыякультурнай прасторы, а таксама цэлым комплексам глабальных праблем.

Сучасны еўрапейскі (заходні) крызіс у сацыякультурным яго аспекце звязваецца ў першую чаргу з крызісам хрысціянства, секулярызацыяй, постмадэрнізмам, для якога чалавек — гэта ўжо не асоба, а індывідуальнасць, ён добры па сваёй прыродзе, цалкам аўтаномны, мае шчасце ў асалодзе, не

памятае гісторыі і т.п. Размова ідзе пра аксіялагічны крызіс, калі губляецца Абсалют і знікаюць абсалютныя каштоўнасці: выглядае, што ў маральнім рэлятывізме мы паступова страчваем сваю душу.

Крызіс беларускай нацыянальнай культуры звязаны яшчэ і з тым, што сфера тварэння культуры і сфера яе функцыянавання на дзяржаўна-ўпраўленчым і масавым грамадскім узроўнях даўно аддаляліся адна ад адной. Як слушна лічыў Уладзімір Конан, у гэтым менш за ўсё вінаваты творцы: пісьменнікі, мастакі, навукоўцы, дзеячы культуры наогул. Беларуская літаратура, літаратурная і навуковая распрацоўка роднай мовы, даследаванне беларускай культурнай традыцыі ў Беларусі не ніжэй, чым у іншых краінах. Па некаторых галінах навукі, напрыклад, па выпуску нацыянальнай энцыклапедычнай літаратуры, даследаванні лексікі роднай мовы, вывучэнні літаратуры і нацыянальнага фальклору Беларусь абагнала іншыя краіны.

Разам з тым, мае рацыю філосаф Валянцін Акудовіч, сцвярджаючы, што хаця мы маем сёння свае эліты (інтэлектуальныя, культурныя, палітычныя), аднак у аснове сваёй па-ранейшаму застаемся пераважна простанароднай, плебейскай супольнасцю. І з гэтага нашыя каштоўнасці, натуральна, усё яшчэ палягаюць не ў сферы высокіх ідэалаў свабоды і годнасці, але ў адной простай (але надзвычай падставовай) рэчы – жыць. І жыць любым коштам, не зважаючы на гвалт, прымус, знявагу годнасці… пакуль народ з усім сваім спадчынным плебействам не памрэ…, да таго часу не вырасце нацыя. Гэта значыць, не проста людзі, паядналыя між сабой адно прагай жыць, а грамадства, злучанае ва ўніверсальнае цэлае высокімі ідэаламі гонару, годнасці і свабоды [3, с.79].

*Высокія ідэалы гонару і годнасці заўсёды былі ўласцівыя беларускай шляхце. “Хоць галодны, я свабодны…”, – так пісаў сучаснік Францішка Багушэвіча, пісьменнік, перакладчык, пачынальнік жанру байкі ў беларускай літаратуры Альгерд Абуховіч (псеўданім – Граф Бандзінелі), які нарадзіўся ў шляхецкай сям’і і быў звязаны сваяцтвам з італьянскім арыстакратычным родам (за ўдзел у паўстанні 1863-64 гг. сасланы ў Сібір; пасля вяртання ж ставіў пытанне аб раздачы ўласнай зямлі былым прыгонным). Дарэчы, доўгі час Альгерд Абуховіч жыў у маім родным Слуцку, адкуль бярэ пачатак не адзін беларускі шляхецкі род, у тым ліку і вядомага прафесара гісторыі, старшыні Згуртавання беларускай шляхты Анатоля Грыцкевіча.*

*Сёння ідэалы гонару, годнасці і свабоды сарамліва маўчаць… У тым ліку і ў такім нібыта дробным выпадку, калі беларускія дзяўчаты і жанчыны апранаюцца, карыстаюцца касметыкай і паводзяць сябе не раўнуючы, прашу прабачэння, як у адным вялікім публічным доме, выклікаючы здзіўленыя воклічы рэдкіх на нашых вуліцах замежных турыстаў: “О, у вас столькі прастытутак!” Гэтаму ёсць тлумачэнне, але няма апраўдання. Між тым*

*усім вядома, як тонка і далікатна ставяцца да асобы чалавека і гендэрных пытанняў у ЗША, дзе полавая роўнасць – не ў тым, каб кабеты гублялі сваю прывабнасць і жаночую сутнасць, калі яны ў асексуальных брудных спецоўках выконваюць цяжкую фізічную працу (успомнім тыпажы савецкіх плакатаў), а ў падкрэсленым шанаванні годнасці – чалавечай і жаночай. Шматлікія нашумелыя скандалы (з Білам Клінтанам, Строс-Канам у галоўных ролях) пацвярджаюць гэтую тэзу.*

*Ідэалы свабоды не рэалізуюцца, калі прыгнятаецца індывідуальнасць – прыгнятаецца псіхалагічна, у тым ліку колішнімі звычкамі савецкага калектывізму задавіць усё інакшае, адмысловае, усё, што хоць неяк выдзяляецца на агульным фоне: вельмі папулярны “мудры” прынцып “не высоўвайся!” І не высоўваемся: сядзім ціхенька, бо “мая хата скраю…” і “хто крычыць – хай крычыць, а мы, баба, едзьма…”*

*Толькі, не “высоўваючыся”, што важнае можна зрабіць, якіх выключных поспехаў дасягнуць і як спраўдзіць сэнс свайго жыцця?*

Вызначаючы сутнасць сучаснага постмадэрнізму, В.Акудовіч бачыць у ім быццё без сэнсу, быццё без якога-кольвечы фармуючага цэнтр Абсалюту, быццё без сярэдзіны і берагоў, быццё як татальнасць быцця… [3, с.157-158]. Тое, што вызначаецца як стабільнасць, насамрэч ёсць культурным крызісам, прыкметы якога: разбурэнне натуральнага цыклу культурнай дынамікі, спыненне працэсу змены пакаленняў культурнай эліты, татальная міфалагізацыя культурнага асяроддзя і інш.

Беларускія культуролагі прапануюць розныя формы пабудовы жыццяздольнай прасторы беларускай культуры. Так, на думку Максіма Жбанкова, належыць рэалізоўваць адукацыйныя праекты новага пакалення, засвойваць навейшыя інфармацыйныя тэхналогіі, фарміраваць нацыянальную поп-культуру, выроўніваць “перакос” інфармацыйных плыняў усходнееўрапейскага матэрыялу (пад лозунгам “Зноў разам – але ўжо ў Еўропе”), рэальнага шматмоўя [4, с.163].

Як заўважае Альміра Усманава, варта ўслед за тэарэтыкамі брытанскай школы “культурных даследаванняў” звяртацца да вывучэння паўсядзённай культуры як пасрэдніка паміж мастацтвам, навукай і матэрыяльнай вытворчасцю, паміж уладаю і простымі людзьмі, паміж дамінуючай ідэалогіяй і альтэрнатыўнымі сацыяльнымі дыскурсамі, асабліва з улікам таго, што ў нас існуе востры палітычны раскол паміж афіцыйнымі палітычнымі элітамі і разнастайнай культурнай і палітычнай апазіцыяй, складаная дыялектыка паміж “бачным” і “нябачным” у сучаснай Беларусі. На думку даследчыцы, беларускі культурны ландшафт характарызуецца семіятычнай няўцямнасцю, прыкладам чаго могуць служыць хаця б

“скульптурныя шэдэўры” ў мінскім аэрапорце – увасабленне дробнабуржуазнай пошласці, узведзенай у ранг нацыянальнага стылю [5, с.12, 20].

Сёння Беларусь адначасова і традыцыйная, і мадэрновая, і савецкая, і еўрапейская. І гэта стварае фундамент, з аднаго боку, сацыяльнай салідарнасці, якая магчымая не ў гамагеннасці, а ў шматстайных формах і спосабах сацыяльнай самаарганізацыі [6, с.81], а з іншага, полікультурнасці і міжкультурнага дыялогу, што выхоўвае талерантнасць асобы і грамадства.

Беларуская нацыянальная культура павінна падтрымлівацца і развівацца ва ўсіх сваіх формах, стылях, жанрах, відах і праявах. Грамадзянская, дзяржаўная і іншыя канцэпцыі нацыянальнага развіцця, якія не засноўваюцца на культурна-моўным кантэксце як аснове цэласнага беларускага нацыянальнага арганізму, губляюць сваю грунтоўнасць перад сучаснай культурна-моўнай сітуацыяй у Беларусі, якая поруч з іншымі фактарамі ўжо прывяла да дэградацыі ў сацыякультурнай і эканамічнай сферах і стварыла сітуацыю сур’ёзнейшай пагрозы беларускай нацыянальнай бяспецы. Усе развагі пра адмысловасць беларускай мадэлі, якая, мусібыць, уключае ў сябе і магчымасць “небеларускай” Беларусі, элементарна і куды ўжо болей відавочна разбіліся сённяшнімі рэаліямі. Не трэба мудрыць і займацца шкоднай дэмагогіяй і самаапраўданнем, варта яшчэ раз глянуць на вопыт блізкіх нам ментальна, культурна і гістарычна Польшчы, Славакіі і іншых краін, якія шануюць сваю нацыянальна-культурную адметнасць і рэалізуюць сістэмную, добра прадуманую культурную палітыку.

Дэмаралізацыя, інтэлектуальная дэградацыя, нізкі агульны культурны ўзровень сучаснага грамадства Беларусі (прыкладаў можна прывесці безліч), феадальныя адносіны “бяспраўны васал – сеньёр”, якія пранізваюць усё грамадства, асабліва ж у дзяржаўнай сферы, адсутнасць або значная аслабленасць нацыянальнага гонару і чалавечай годнасці ёсць прамым вынікам неіснавання грамадства ў натуральным культурна-моўным кантэксце: выглядае, што нацыянальная культура, якая грунтуецца на духоўных і маральных асновах быцця, існуе асобна ад сучаснага беларускага грамадства.

Невыразнасць, няўцямнасць нацыянальнага стылю і почырку сучаснай масавай Беларусі перарастае ў поўную цішыню, у маўчанне і, такім чынам, размовы пра адмысловасць т. зв. беларускай “мадэлі” пераходзяць у апраўданне працэсу дэфармацыі, здзічэння беларускай душы і характару.

Без вырашэння нацыянальнага пытання немагчыма дабіцца ні дэмакратыі, ні сацыяльнай справядлівасці.

*Рабы будаваць дэмакратыю і карыстацца з дэмакратыі не могуць. Будаваць дэмакратыю і карыстацца з дэмакратыі могуць ствральнікі*

*сваёй краіны – канкурэнтаздольныя, творчыя, здатныя неастандартна мысліць і адстойваць уласную пазіцыю і правату.*

Калі няма паўнацэннага нацыянальна-культурнага арганізму, які праз духоўна-культурныя традыцыі мацуе і пэўныя сацыяльныя нормы, у тым ліку ў сферы грамадскай маралі, то лёгка адкідваецца і прафесіяналізм, а значыць – і прафесійныя рашэнні.

*Коратка падсумоўваючы, можна сцвярджаць, што адлучанасць беларускага грамадства ад беларускай нацыянальнай культуры і мовы стала асноўнай прычынай занядбання і разбурэння так званых трох “П” — прафесіяналізму, праведнасці і пасіянарнасці.*

**Беларуская культурная стратэгія мусіць абапірацца на нацыянальную ідэнтычнасць і міжкультурны дыялог**

Для расколатых і разарваных краін, памежжаў як месцаў існавання канфліктаў або памяці пра іх вялікае значэнне ў захаванні гарманічных сацыяльных узаемаадносін і самаідэнтычнасці грамадства і чалавека ў ім мае нацыянальна-культурная агульнасць. Кансалідацыя грамадства на падставе перадусім духоўна-культурнай, а не ідэалагічнай агульнасці можа вызначыць моц і перспектыву сучаснай Беларусі з яе схаваным цывілізацыйным суперніцтвам ідэалогій і рэлігійных канфесій. Гэта патрабуе высокага ўзроўню нацыянальнай ідэнтычнасці.

Вынікам слабасці беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці на фоне разнастайнасці і шматлікасці яе ўзаемавыключальных версій (заходнерусізм, тутэйшасць, ідэнтычнасці савецкая, нацыянальна-адраджэнская, еўрапейская і інш.) стала не толькі адсутнасць належнай нацыянальнай кансалідацыі і грамадскай згоды, але нават спроба звядзення ўсёй беларускай нацыі да нацыянальнай меншасці.

Умацаванне беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці патрабуе: аб’ектыўнай трактоўкі беларускай гісторыі; пазбаўлення ад савецкіх менталітэту, стэрэатыпаў і ацэнак; стварэння пантэону беларускіх герояў (перш за ўсё сродкамі літаратуры, мастацтва і мас-медыя); нацыянальнай міфатворчасці; пераходу ад каланіяльнага мыслення да беларускацэнтрычнага; папулярызацыі беларускіх каштоўнасцей і ідэалаў; адраджэння беларускіх шляхецкіх традыцый; адмаўлення ад канцэптаў еўразійскасці; прыняцця Закона аб абароне беларускай мовы і рэгулявання моўнай сітуацыі, як тое прынята ва ўсіх суверэнных дзяржавах; павагі да асобы чалавека і праяў усялякай індывідуальнасці; стварэння і папулярызацыі беларускіх брэндаў ( у тым ліку ў эканамічнай сферы) і інш.

Беларуская нацыянальная ідэнтычнасць непарыўна звязаная з дэмакратычнымі традыцыямі, вяршэнствам закона і ідэаламі свабоды:

барацьба за правы і вольнасці ў Беларусі мае цікавую і насычаную гісторыю і яшчэ патрабуе шырэйшага вывучэння і папулярызацыі. Тут імёнаў Льва Сапегі, Сымона Буднага, Астафія Валовіча, Альбрэхта Гаштольда яўна недастаткова!

Ізаляцыянізм, які даваў гарантыі культурнага і іншага суверэнітэту, сябе вычарпаў. Асноўнай рысай глабальнага мыслення і дзеяння стала адкрытасць грамадства, поліфанія меркаванняў, ідэйных платформ, пазіцый, што склала аснову міжкультурнага дыялогу, які грунтуецца на правах чалавека, сярод якіх галоўныя каштоўнасці – свабода і роўнасць.

Менавіта нацыянальная культура можа выступаць асноўным суб’ектам сучаснага дыялогу культур у міжнародным яго вымярэнні, пры гэтым важна мець на ўвазе, што дыялог культур магчымы ў выпадку, з аднаго боку, адсутнасці супрацьстаяння, а з іншага, – вернасці ўласнай традыцыі (уключаючы ясна выяўленыя перакананні) і павагі да іншай.

Выключную ролю ў міжкультурным дыялогу адыгрывае мастацкая літаратура: яна аперуе і паслугуецца сістэмамі нацыянальных каштоўнасцей (у тым ліку мовай), звернута да шырокага кола грамадства, праз пераклады твораў іншых літаратур узмацняе энергетычнае поле ўласнай нацыянальнай культуры і пашырае формы міжкультурнага ўзаемадзеяння.

Як піша Ірына Шаблоўская ў кнізе “Сусветная літаратура ў беларускай прасторы”, успрыняцце амерыканскай літаратуры ў беларускім асяроддзі мае розныя праявы: на ўзроўні ведання імёнаў пісьменнікаў і твораў у шырокіх колах насельніцтва, на ўзроўні “цытацыі” і прысутнасці ў творах сваіх пісьменнікаў, у роднай літаратуры і мастацтве; у даследаваннях філолагаў-амерыканістаў; прысутнасць амерыканскай літаратуры ў працэсе адукацыі.

Амерыканскія пісьменнікі пачалі перакладацца на беларускую мову ў 20-ых гадах мінулага стагоддзя (Генры Лангфэл і Уолт Уітмен у перакладзе Юркі Гаўрука, Джэк Лондан у перакладзе А.Мардвілкі і інш.). У розныя гады з’яўляліся пераклады апавяданняў Ш.Андэрсэна, Р.Брэдберы, Э.Колдуэла, Э.Хэмінгуэя, Р.Шэклі, М.Твэна. На старонках штогодніка “Далягляды” з 1982 г. друкаваліся навелы Д.О’Хары, К.Макалерс, Э.С.Гарднера (пер. У.Шчаснага), Э.Бірса (пер. А.Кудраўцава), Р.Брэдберы (пер. М.Кандрусевіч), Ш.Андэрсэна (пер. М.Чыкалава), эсэ У.Фолкнера і Дж. Стэйнбека. Амерыканскіх аўтараў (К. Вонегут, А.Кларк і інш.) перакладалі на беларускую мову таксама А.Асташонак, С.Дорскі, Л.Чарнышова і інш.

Што датычыць тэатральнага мастацтва, то ў Беларусі ставіліся Т.Уільямс (“Арфей спускаецца ў пекла”, “Трамвай “Жаданне”, “Мілагучная птушка юнацтва”), Ю. О’Ніл (“Любоў пад вязамі”, “Журба – лёс Электры”), Э.Олбі (“Усе ў садзе”, “Не баюся Вірджыніі Вулф”) і іншыя вядомыя драматургі мінулага стагоддзя.

Беларускі стэрэатып Амерыкі ўсё мінулае стагоддзе ўключаў у сябе ўяўленні пра краіну кантрастаў, белых і чорных, багатых і жабракоў: міф пра Амерыку складваўся ў пачатку мінулага стагоддзя, калі асэнсоўвалася Амерыканская Мара, якая можа абярнуцца Амерыканскай Трагедыяй. Аднак беларуская літаратура прапануе і іншае ўспрыманне Амерыкі – другой Бацькаўшчыны, як, напрыклад, у апавяданні Максіма Гарэцкага “Амерыканец”, упершыню надрукаваным у 1917 г., дзе паказваецца, як востры настальгічны сум па Радзіме не заглушаецца ніякім багаццем, прыдбаным на чужыне.

Міжкультурны дыялог іманентна ўласцівы беларусам з іх ментальнасцю ліберальнага тыпу (у адрозненне, напрыклад, ад рускай таталітарнай ментальнасці, на што ўказвае ў сваіх працах гісторык Захар Шыбека), як, зрэшты, і дыялог рэлігійны, актуальнасць якога ў сучасным свеце таксама ўзрастае: унутраны змест людзей становіцца радыкальна адрозным ад папярэдніх эпох, і ў спробе сфарміраваць у чалавеку элементарную здольнасць адрозніваць Дабро і Зло рэлігійныя канфесіі маюць выдатны падмурак для ўзаемаразумення.

Менавіта на беларускіх землях шчыльна судакраналіся і судакранаюцца праваслаўе і каталіцтва; у нас – як цікавая спроба іх сінтэзу – нарадзілася ўніяцтва; у нас у эпоху Рэфармацыі і XVII стагоддзя быў адчувальны ўплыў пратэстантызму. Як аргументавана піша Галіна Сініла, на нашых землях з XIV ст., пасля таго, як князь Вітаўт адчыніў браму Вялікага Княства Літоўскага яўрэям – і караімам, цэнтрам якіх сталі Трокі (Тракай), і ашкеназам, што ратаваліся ад праследаванняў часоў «чорнай смерці» (чумы) на землях Заходняй і Цэнтральнай Еўропы (перадусім у Германіі), – пачала складвацца асаблівая культура яўрэяў-літвакаў, якая ўвабрала ў сябе шмат чаго з беларуска-літоўскага культурнага ландшафту, і цэнтрам якой стала Вільня. Гэты горад, які атрымаў у яўрэйскай традыцыі ні з чым не параўнальнае найменне – *Йерушалаім дэ-Літа* («Літоўскі Іерусалім»), стаў сімвалам адзінства і шматстайнасці культуры самой па сабе, горадам, які назаўжды ўжо належыць культурам, што ў ім перасякліся і перапляліся, – беларускай, літоўскай, польскай, яўрэйскай [7]. Тут, у Беларусі, нарадзіліся і выраслі мастакі, самі імёны якіх зрабіліся эмблемаю сінтэзу і дыялогу культур – яўрэйскай, беларускай, заходнееўрапейскай, а ў шырокім сэнсе – сімвалам культуры сусветнай, – Марк Шагал і Хаім Суцін.

У Беларусі развівалася і развіваецца мусульманская культура, перадусім татарская, якая таксама актыўна кантактуе з культурай этнічна-беларускай. Усё гэта прадвызначыла высокую ступень плюралістычнасці беларускай культурнай парадыгмы і стала амбівалентнай крыніцай яе ўнутранага патэнцыялу: з аднаго боку, беларуская культура на часавым і прасторавым

цывілізацыйным узаемаўплыве выпрацавала высокую ступень устойлівасці і здольнасці да культурна-моўнай інтэрферэнцыі з захаваннем “культурнага ядра”, якое на працягу некалькіх стагоддзяў служыла гарантам перыядычнага нацыянальна-культурнага адраджэння; з іншага ж боку, высокі ўзровень энтрапіі, якім характарызуецца полікультурнае і трансцывілізацыйнае грамадства, як, напрыклад, амерыканскае, тэарэтычна павінен забяспечваць развіццё сацыякультурнай супольнасці праз засваенне новых культурных формаў і пераўтварэнне існуючых традыцыйных, што ў беларускім выпадку, аднак, тармазілася прыгнячэннем уласна-беларускай культурнай традыцыі, а ў некаторых выпадках – і традыцыйнай беларускай кансерватыўнасцю.

Па сваёй сутнасці беларусы гасцінныя, міралюбівыя і вынослівыя. Унікальныя міралюбівасць і вытрымка беларусаў даказваюцца мноствам фактаў, у тым ліку безумоўным адмаўленнем ад ядзернай зброі на золку незалежнасці (пры неабходнасці вялікіх матэрыяльных затрат на ліквідацыю вынікаў Чарнобыльскай катастрофы), паўставаннем і выжываннем у няпростых умовах беларускага прадпрымальніцтва і інш.

Талерантнасць і мяккасць беларусаў надзвычай важныя для наладжвання любога дыялогу, але патрабуюць большай крытычнасці, асабістай годнасці, рашучасці, здольнасці пастаяць за сябе.

Асабістая годнасць, рашучасць, самаўпэўненасць маглі б фарміравацца такім патрыятычным выхаваннем, якое б абапіралася на разуменне прыналежнасці да гістарычна моцнага, старажытнага народа, які мае глыбокія традыцыі, свае ўласныя ідэалы і каштоўнасці. Усё гэта знаходзіць сваё ўвасабленне ў першую чаргу ў нацыянальнай культуры і ў іншых складковых нацыянальнага стрыжня – нацыянальнай ідэнтычнасці, самасвядомасці, нацыянальнай волі і нацыянальнага інтарэсу.

Для рэалізацыі адпаведнай культурнай палітыкі, накіраванай на ўмацаванне нацыянальнага стрыжня, вялікае значэнне магло б мець перайманне і канструктыўнае засваенне вопыту Злучаных Штатаў Амерыкі, дзе існуе добра адладжаная, гнуткая, мабільная, сучасная сістэма падтрымкі культуры, заснаваная на самастойных рэгіянальных рашэннях, заахвочванні і мецэнацтве [8, с. 97 – 104].

Я бязмежна веру ў беларускія магчымасці. Трэба толькі ў сабе і вакол выхоўваць чалавека, які любіць свабоду і здатны пазбавіцца страху і сораму.
Ад кожнага з нас залежыць многае, бо сіла асобы, як сведчыць амерыканскі досвед, невычарпальная.

**Літаратура:**


1. Серватка, М. Вітальнае слова падчас прэзентацыі-семінара “Як захаваць культурную самабытнасць” (Мінск, 02 чэрвеня 2010 г.) /Мар’ян Серватка // Захаванне нацыянальнай самабытнасці ў кантэксце развіцця міжкультурнага дыялогу; рэдкал.:Л.Уладыкоўская (гал.рэд.) [і інш.] / – Мінск: РІВШ, 2011. – С16 – 18.
2. Уладыкоўская-Канаплянік, Л. Дзяржава і культура / Л. Уладыкоўская-Канаплянік // Разнастайнасць моў і культур у кантэксце глабалізацыі: матэрыялы Міжнароднага сімпозіума. Т.1. Мінск, 8 – 9 ліпеня 2002 г. – Мінск, 2003. – С.306 – 309.
3. Акудовіч, В. В. Архіпелаг Беларусь: кніга дыялогаў / Валянцін Акудовіч. – Мінск: Галіяфы, 2010. – 240 с.
4. Жбанкоў, М. Беларуская культура: час нуль/  Максім Жбанкоў// Белорусский формат: невидимая реальность; сборник научных трудов; отв. ред. А.Р.Усманова. – Вильнюс: ЕГУ, 2008. – С.141-164.
5. Усманава, А. Беларусь LIVE: лад жыцця як жыццё вобразаў / Альміра Усманава // Белорусский формат: невидимая реальность; сборник научных трудов; отв. ред. А.Р.Усманова. – Вильнюс: ЕГУ, 2008. – С.9-28.
6. Шпарага, В. Да накіду інтэлектуальнай тапаграфіі Беларусі/ Вольга Шпарага//  Белорусский формат: невидимая реальность; сборник научных трудов; отв. ред. А.Р.Усманова. – Вильнюс: ЕГУ, 2008. – С.71 – 86
7. Сініла, Г. Значэнне дыялогу для жыцця нацыянальнай і сусветнай культур і для пошукаў ідэнтычнасці / Галіна Сініла // Захаванне нацыянальнай самабытнасці ў кантэксце развіцця міжкультурнага дыялогу; рэдкал.:Л.Уладыкоўская (гал.рэд.) [і інш.] / – Мінск: РІВШ, 2011. – С. 79 – 91.
8. Уладыкоўская, Л. Як захаваць культурную самабытнасць?: Сучасныя нарысы да некаторых аспектаў праблемы /Л.Уладыкоўская. – Мінск, 2010. – 116 с.

## 5. Амерыканская культура: сацыяльнае і міжнароднае вымярэнні

Ад нацыі, якая ажыццявіла кардынальны пераварот у свеце ў палітычным, сацыяльным і эканамічным плане, чакаліся вялікія змены і ў культуры. Калі свабода, якую набылі амерыканцы, знішчыла старыя формы кіравання, то чаму не чакаць таго ж у сферы мастацтва і творчасці?

Аднак Амерыка доўга яшчэ заставалася падпарадкаванай Еўропе ў культурным плане, аднаўляючы еўрапейскія ўзоры мастацтва і густу. Толькі з сярэдзіны XIX ст. стала магчымым гаварыць пра фарміраванне новых культурных стандартаў. У 1837 г. літаратар Ральф Уолда Эмерсон у сваёй прамове “Амерыканскі вучоны” акрэсліў грандыёзны праект культурнай незалежнасці, які прадугледжваў унікальную, дэмакратычную перспектыву чалавечага бачання, што адпавядала б амерыканскай форме кіравання.

У той час Амерыка была асабліва маладой і наіўнай, і ёй, верагодна, не хапала ўласнага мастацкага матэрыялу. Але з іншага боку, адсутнасць культурнай спадчыны манархічных і дэспатычных нацый давала поўны прастор розуму і гарантавала адкрытасць да любых фантазій і ўплываў. Амерыканскае мастацтва павінна было выявіць творчую экспрэсію ўсяго народа, а не толькі асобных творцаў, эліты. Дзесяткі дзеячоў культуры дэкларавалі “каштоўнасць простых рэчаў”. Вера ў веліч будучай амерыканскай культуратворчасці падмацоўвалася ідэяй, што культура перамяшчаецца па руху сонца – з усходу на захад (Старажытная Грэцыя – Рымская Імперыя – Заходняя Еўропа). Трэцяя прычына, якая апраўдвала выклік культурным каштоўнасцям Старога Свету, датычыла творчых магчымасцей Амерыкі, дзе прысутнічаў свежы і самабытны матэрыял і дзе мастак жыў натуральным жыццём, набіраючыся ўласных уражанняў, пазнаючы свет непасрэдна, а не праз фільтры чужых уяўленняў.

Драматург Райал Тайлер сцвярджаў перавагу амерыканскай простасці перад еўрапейскай пампезнасцю, Уільям Данлэп і Ной Уэбстэр ухвалялі амерыканскі патрыятызм. “Трансцэндэнталісты” – аўтары-эсэісты з Новай Англіі (Эмерсон, Генры Дэвід Таро, Маргарэт Фуллер і інш) – заклікалі зірнуць за межы звыклых уяўленняў пра чалавечыя магчымасці. Эдгар Алан По цікавіўся больш за ўсё межамі чалавечага розуму ў шматлікіх перыпетыях рэальнасці. Звычайна людзі набываюць веды праз зварот да знешняга свету з яго грамадскімі законамі і традыцыямі, а амерыканцам, на думку Э.По, якраз гэтага і не хапае. Менавіта таму яны вымушаны шукаць адказы на пытанні ўнутры сябе.

Хаця, напрыклад, Вашынгтон Ірвінг засноўваў свае сюжэты на еўрапейскіх матывах, а Джэймс Фенімор Купер глядзеў на Еўропу як на

дасведчанага настаўніка, аднак усе амерыканскія пісьменнікі аддавалі перавагу амерыканскай глебе.

Сярод родапачынальнікаў амерыканскай паэзіі – афраамерыканка Філіс Уітлі з яе хрысціянскай і сацыяльнай тэматыкай, Уільям Каллен Брайант з услаўленнем прыроднай красы Амерыкі, Эмілі Дзікінсон з яе ціхай самазаглыбленай творчасцю. І, безумоўна, палымяныя вершы Уолта Уітмена (перакладзеныя, дарэчы, на беларускую мову Янкам Сіпаковым), які да самазабыцця адстойваў амерыканскія нормы і амерыканскі лад жыцця.

Зрэшты, знаходзіліся і аўтары, якія ставіліся да амерыканскай рэчаіснасці з вялікай доляй асцярожнасці, як, напрыклад, Натаніэль Гаторн ці Герман Мелвіл.

Вялікі рэзананс у амерыканскім грамадстве выклікала кніга Гарыет Бічэр-Стоу “Хаціна дзядзі Тома” (1852 г.), у якой аўтар падняла пытанне пра несумяшчальнасць рэспубліканскіх і хрысціянскіх ідэалаў з рабствам. Пісьменніца адкрыта заяўляла пра віну ўсіх амерыканцаў у сацыяльным зле, што творыцца на Поўдні. Экспрэсіўнасцю, напорам, запалам, сацыяльнай накіраванасцю пісьменніца нагадвае беларускую паэтэсу Цётку (Алаізу Пашкевіч.

Амерыканскія жывапісцы таксама аддавалі перавагу нацыянальным тэмам і захапляліся айчыннымі пейзажамі, аднак прызнавалі аўтарытэт і еўрапейскай школы жывапісу.  Так, прадстаўнікі “Лонданскай школы” Джон Сінглтан Коплі, Гілберт Сцюарт, Чарльз Уілсан Піл плавалі на Усход (у Брытанію), каб пазнаць і зразумець Захад. Іх працы характарызаваліся ўрачыстасцю, годнасцю і манументальнасцю.

Джон Трамбал прысвяціў шэраг прац вайне за незалежнасць, па даручэнні Кангрэса ён упрыгожыў Капітолію ў Вашынгтоне, хаця партрэты Дж. Вашынгтона аўтарства Гілберта Сцюарта (лепшы з іх – “Партрэт Джорджа Вашынгтона ў Аценеуме”, 1796 г.), якія таксама ўпрыгожваюць Капітолію, атрымалі большае прызнанне.

Сярод амерыканскіх мастакоў былі і такія, якія засяроджвалі свой талент на паўсядзённым жыцці. Напрыклад, Уільям Сідні Маўнт, Рычард Катан Вудвіл і Джордж Калеб Бінэм, якія ўзялі на ўзбраенне галандскі жанравы жывапіс з яго вялікай увагай да лініі, колеру, святла і кампазіцыі, малявалі карціны з жыцця розных этнічных і сацыяльных груп Амерыкі. Гэтыя мастакі стварылі абагулены партрэт амерыканскага народу.

Багацце, разнастайнасць і адухоўленасць роднай прыроды, яе некранутасць сталі ідэальным матэрыялам для Томаса Коўэла – самага знакамітага амерыканскага пейзажыста, які ажыццявіў творчы прарыў і даказаў , што амерыканская прырода валодае магіяй гармоніі і красы. У сваёй

карціне “Выгляд з гары Халіоўк” (1836 г.) мастак візуалізуе кантраст паміж дзікай прыродай і цывілізацыяй.

Мяккія і спакойныя пейзажы Эшэра Дзюрана – майстра ландшафтнага жывапісу, яркія і велічныя карціны Альберта Бірштадта і Томаса Морана як гімн дзікай прыродзе і “дзікаму Захаду”, экзатычныя выявы на палотнах Фрэдэрыка  Эдвіна Чэрча – усё падкрэслівала, што Амерыка – незвычайная і цудоўная краіна, і амерыканцы могуць ганарыцца сваёй Айчынай.

І яны ганарацца.

*Той незвычайны амерыканскі патрыятызм здзіўляе і да сённяшняга дня кожнага, хто бачыць дзяржаўны амерыканскі сцяг каля кожнага дому (вывешаны цалкам добраахвотна, па ўнутраным перакананні, без усялякага прымусу і адпаведнай ідэалагічнай працы) і сустракаецца з абсалютным перакананнем амерыканцаў, што іх краіна – найлепшая ў свеце.*

Атмасфера трыумфу і самаўпэўненасці, якая панавала пасля рэвалюцыі, з часам ахапіла ўсе сферы жыцця амерыканцаў. Цяжка было сумнявацца, што гэтай нацыі суджана адрадзіць усё чалавецтва, у тым ліку духоўна і культурна, і змяніць увесь свет.

Нацыя, якая перавярнула ход сусветнай гісторыі, прэтэндавала і на асаблівую ролю ў справе выратавання душы. У аснове рэспубліканскага рэлігійнага абнаўлення пачатку ХІХ ст. (“Другое Вялікае Абуджэнне”) ляжала ідэя адраджэння, якую неслі пратэстанты-евангелісты, і дэмакратызацыі хрысціянства. Актыўны ўдзел у апалагетыцы евангелічнай веры бралі і жанчыны, і нявольнікі, якія разгледзелі тут заклік да непадпарадкавання белым гаспадарам з наступным вызваленнем і ўроўніваннем сацыяльнага статусу.

Апроч Афрыканскай метадысцкай епіскапальнай царквы, Другое Вялікае Абуджэнне спрыяла ўзнікненню і іншых рэлігійных рухаў – адвентыстаў, мармонаў і інш. Нацыя станавілася ўсё больш разнастайнай у рэлігійных адносінах. Выглядала, што Амерыцы самім лёсам прызначана несці чалавецтву не толькі свабоду, але і выратаванне.

Амерыканскі народ заўсёды захоўваў высокую палітычную актыўнасць. Як правіла, евангелічныя пратэстанты Поўначы і Сярэдняга Захаду падтрымлівалі рэспубліканцаў з іх адстойваннем высокамаральнага ладу жыцця, у той час як каталіцкія імігранты паўночнага ўсходу і белыя жыхары паўднёвых штатаў арыентаваліся на дэмакратаў і іх заклікі да свабоды.

У пачатку ХХ ст. ЗША былі ўжо не сельскагаспадарчай краінай, а індустрыяльнай, а на змену культурнай разнастайнасці прыйшла этнічная шматаблічнасць. Узбуйненне і кансалідацыя прамысловых кампаній, тэхналагічнае наватарства, укараненне новых прагрэсіўных метадаў кіравання – усё гэта стымулявала далейшы рост амерыканскай індустрыі.

Рэзка ўзрастала колькасць гарадоў (з 400 у 1860 г. да 2200 у 1910 г.), яны ўзбуйняліся, пераважна за кошт імігрантаў з Усходняй і Паўднёвай Еўропы, якія мільёнамі хлынулі ў Амерыку. Як правіла, гэта былі католікі і іудзеі, якія не валодалі ангельскай мовай і рассяляліся кампактнымі групамі, утвараючы італьянскія, славянскія і яўрэйскія абшчыны.

Паступова пераглядаліся традыцыйныя ўяўленні пра ролю асобы і грамадства, падкрэслівалася важнасць грамадскай свядомасці, агульнанародных інтарэсаў.

Несправядлівасці і супярэчнасці амерыканскага жыцця адлюстроўвала мастацкая літаратура: раман “Спрут” (1901 г.) Фрэнка Норыса быў прысвечаны канфлікту паміж фермерамі і буйнымі карпарацыямі, раман “У пошуках новага шчасця” (1890 г.) Уільяма Дзіна Хоуэлса раскрываў сутнасць карумпаванай улады новага рынку, “Сястра Кэры” (1900 г.) Тэадора Драйзера закранала праблему разбуральнага ўплыву горада на нявінную юную душу…

Літаратура садзейнічала развіццю магутнага руху за змену існуючага парадку – прагрэсізму, які аб’ядноўваў намаганні за правядзенне сацыяльных рэформаў (ключавыя постаці – Тэадор Рузвельт і Вудро Вільсан) і адстойваў прынцыпы калектыўнай дзейнасці, цэнтралізаванага кантролю і ўзмацнення народнай улады, а таксама суфражызму – руху за раўнапраўе жанчын. У 1920 г. амерыканскія жанчыны атрымалі роўнае з мужчынамі выбарчае права.

ЗША проста і элегантна вырашылі “індзейскую праблему” у 1830-ых гг.: проста перасялілі усходнія плямёны на заходні бараг Місісіпі. Калі гэтыя малапрыгодныя землі – “Вялікая Амерыканская пустыня” – не маглі паслужыць амерыканскаму рынку, то чаму б іх не выкарыстаць для вырашэння палітычных і сацыяльных праблем? Так нарадзілася ідэя стварэння “індзейскіх тэрыторый”.

З цягам часу, аднак, зямлі не хапала, і індзейцаў адсялялі ўсё далей. Карэннае насельніцтва фактычна вымірала як ад грабежніцтва і фізічнага знішчэння, так і ад інфекцыйных хвароб і алкаголю. У выніку колькасць індзейцаў катастрафічна скарацілася, і да пачатку 1880-ых гадоў склала ўсяго 250 тыс. чалавек.

Наступная ініцыятыва федэральных уладаў была накіраваная на рэалізацыю ідэі, згодна з якой карэнныя жыхары павінны зрабіцца ў меншай ступені індзейцамі, а ў большай – амерыканцамі. Асіміляцыя індзейцаў датычыла змянення іх свядомасці з калектыўнай на індывідуальную, дзеля чаго пачала практыкавацца такая з’ява, як адбіранне індзейскіх дзяцей і прымусовае іх навучанне ў спецыяльных інтэрнатах. Такім чынам, на працягу стагоддзя (1830 – 1930 гг.) індзейцаў пазбавілі спачатку зямлі, а потым і нацыянальнай самасвядомасці.

Тое, што дапамагло ў змаганні з індзейцамі дома, магло дапамагчы і ў замежных стасунках. Амерыканцы заўсёды свята верылі ў сваю місію, што падмацоўваў і амерыканскі евангелізм: не было сумненняў у перавазе палітычнай, эканамічнай, ваеннай і расавай. Дэмакратычны, рухомы, схільны да індывідуалізму амерыканскі характар патрабаваў новых зямель, новых рынкаў, новых магчымасцей, што было прадэманстравана далучэннем Аляскі ў 1867 г., Гавайяў у 1900 г., кантролем над Філіпінамі у 1898 г. і інш.

На міжнароднай павестцы дня ў ЗША стаялі дзе асноўныя задачы: прывіваць слабым краінам універсальныя нормы разумных паводзін і адначасова накіроўваць мацнейшыя дзяржавы да належнага выкарыстання іх сілы. Як сцвярджаў прэзідэнт (1913 – 1921 гг.) Вудро Вільсан, амерыканцы павінны паказаць сябе “нацыяй, якая лепш за іншых здольная дэманстраваць цудоўную непрадузятасць рашэнняў, годнасць самакантролю, эфектыўнасць беспрыстрасных дзеянняў; нацыяй… якая захоўвае здольнасць і свабоду дзейнічаць сумленна і бескарысна для захавання міру ва ўсім свеце…”

Рэспубліканцы, якія кіравалі ў Белым доме ў 1921-1933 гг., адмаўлялі калектыўныя прынцыпы прагрэсізму і сцвярджалі, што веліч Злучаных Штатаў грунтуецца на высілках адзінак. У аснове амерыканскай сістэмы ляжыць просты прынцып: “Толькі арганізаваная свабода і роўныя магчымасці для асобаў здольныя падштурхнуць ініцыятыву і прадпрымальнасць гэтых асобаў на шляху да прагрэсу”. Як даказваў прэзідэнт (1921 – 1923 гг.) У. Гардынг, грамадзяне не павінны чакаць дапамогі ад краіны, а самі мусяць імкнуцца аказаць дапамогу ўраду і краіне. Рэспубліканцы адмаўлялі супрацьпастаўленне народных інтарэсаў і інтарэсаў прыватных прадпрымальнікаў і даказвалі, што толькі **сумесныя** інтарэсы, якія звязваюць у адно грамадскі і прыватны сектары эканомікі, могуць забяспечыць росквіт нацыі. Паставіўшы ў цэнтр увагі прынцыпы індывідуалізму, мінімалізму і дэцэнтралізацыі, рэспубліканцы на практыцы імкнуліся даказаць, што той урад лепшы, які менш кіруе.

Першая сусветная вайна пахіснула веру амерыканцаў у незваротнасць прагрэсу. Інтэлектуалы пачалі больш скептычна глядзець на свет, бо навука сведчыла пра ненадзейнасць чалавечага вопыту, адноснай (а не абсалютнай) прыродзе ісціны, надуманым (а не натуральным) характары сусветнага парадку. Усе гэтыя ідэі адлюстраваліся ў амерыканскай літаратуры, прасякнутай горыччу няспраўджаных спадзяванняў. Эзра Паўнд, Эрнест Хемінгуэй, Кэтрын Энн Портэр, Эдна Сент-Вінсент Міллэй і інш. пісьменнікі склалі плеяду “страчанага пакалення”. Творчасць пісьменнікаў – эмігрантаў, і перш за ўсё Э. Хемінгуэя і Э.Паўнда, была напоўнена пачуццём пакінутасці і дэзарыентацыі. Мастакі слова (Ф.Скотт Фітцджэральд, Сінклер Льюіс, Шэрвуд Андэрсан і інш.) выказвалі расчараванне ідэаламі новай эпохі:

дробязнасць інтарэсаў, абмежаванае самадавольства і разбураныя мары – вось што хаваецца пад падманным спакоем амерыканскай глыбінкі.

Уільям Фолкнер выбраў у якасці тэмы ўнутраную драму амерыканскага патрыярхальнага Поўдня. Яркія вобразы і эксперыментальная манера пісьма дазволілі аўтару дабіцца глыбокага псіхалагізму. Персанажам У.Фолкнера даводзіцца весці цяжкую барацьбу з векавымі традыцыямі, расавымі перажыткамі і сямейнымі праблемамі.

Дваццатыя гады XX ст. азнаменаваліся таксама росквітам афраамерыканскай літаратуры (творчасць Клода Маккея, Джына Тумера, Зоры Ніл, Лэнгстана Хьюза і інш.).

Чарнаскурыя выканаўцы ўнеслі неацэнны ўклад і ў развіццё музычнага мастацтва, стварыўшы свой непаўторны стыль, які атрымаў назву джаза. Сваімі каранямі джаз зыходзіў да негрыцянскай музыкі спірычуэлс, рэгтайм і блюз. Ключавым прыёмам у джазе служыла індывідуальная, непрадказальная імправізацыя на зададзеную тэму, што бліскуча прадэманстравалі Луіс Армстронг, Флетчэр Хендэрсон, Бесі Сміт і іншыя выканаўцы.

У той час як у адных галінах амерыканскай культуры ішоў бесперапынны эксперымент і пошук, усё больш стандартызаваны выгляд набывала т.зв. папулярная культура. Па ўсёй краіне распаўсюджваўся аднародны, **нацыянальны стыль**, мова і набор каштоўнасцей. Масавая культура Злучаных Штатаў – гэта прадукт індустрыі забаў, які ўсё актыўней дыктаваў амерыканцам, што ім чытаць, глядзець і слухаць.

У 1926 г. з’явілася радыёстанцыя Эн-бі-сі, а ў 1927 г. – радыёстанцыя Сі-бі-эс, якія па ўсёй краіне транслявалі стандартныя праграмы з музыкі, драмы, камедыі і навін. Надзвычай папулярнымі станавіліся кінатэатры, у якіх паказваліся фільмы ўласнай вытворчасці.

Некаторыя амерыканцы крытычна паставіліся да стандартызаванай прадукцыі, ускладаючы віну за разбурэнне традыцыйнай сістэмы амерыканскіх каштоўнасцей на імігрантаў. Прыхільнікі “натывізму” лічылі, што ўсе беды ідуць ад прышэльцаў – тых, хто не належаў да спаконвечнай, белай, сельскай, пратэстанцкай Амерыкі. У 1915 г. на экраны выйшаў знакаміты фільм Д.У.Грыфіта “Нараджэнне нацыі”, які ўхваляў чысціню расы і сістэму векавых амерыканскіх каштоўнасцей і маральных нормаў і які паслужыў выдатным ідэалагічным падмуркам для куклусклanaўцаў, якія разгарнулі тэрор не толькі супраць афраамерыканцаў, але і супраць яўрэяў, католікаў і ўвогуле імігрантаў.

У рэчышчы агульнай барацьбы з “мадэрнісцкімі” тэндэнцыямі ў 1920-ыя гады ўзнік і ўмацаваўся фундаменталізм – ваяўнічы кансерватыўны напрамак пратэстантызму, які выступіў супраць дарвінаўскага вучэння і па

сутнасці ўвасобіў не толькі барацьбу навукі і рэлігіі, але і трагедыю нацыі, якая не жадала прымаць сучасныя тэндэнцыі.

Матэрыяльна Амерыка квітнела. У краіне ўстанавіўся найвышэйшы ў свеце ўзровень жыцця. Краевугольным камнем амерыканскай эканомікі і сімвалам Амерыкі стаў, безумоўна, аўтамабіль. Аўтамабільная вытворчасць набыла небывалы размах і прыносіла велізарныя прыбыткі. У цэлым у ЗША ў 20-ых гадах спажывецтва ўвайшло ў звычку і норму. Амерыканцы паверылі, што іх мара аб няспынным росце дабрабыту вось-вось збудзецца (як савецкія людзі верылі, што вось-вось пабудуюць камунізм).

Аднак у 1929-1933 гг. эканоміка Злучаных Штатаў увайшла ў стадыю глыбокага спаду. Галоўнай прычынай гэтага была нераўнамернасць даходаў і, як вынік, перавытворчасць тавараў, з аднаго боку, і недастатковае спажыванне, з іншага. Сістэма, заснаваная на бязмежным спажыванні, стала развальвацца на вачах усёй нацыі, выклікаўшы Вялікую дэпрэсію. Аб’ём ВНП знізіўся на 46%, індэкс спажывецкіх цэн упаў на 25% пры адначасовым зніжэнні агульнага індэксу цэн на 32%. Цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю абрынуліся ажно на 60%, што моцна ўдарыла па фермерах. Да 1933 г. чвэрць усіх працаўнікоў сталі беспрацоўнымі.

Герберт Гувер фактычна стаў першым амерыканскім прэзідэнтам, які адстаяў права (і абавязак!) федэральнага ўраду ўмешвацца ў эканамічнае жыццё краіны. Тым не менш, бязмежная вера ў свабоду асобы абмяжоўвала прэзідэнта Гувера ў выбары сродкаў па эканамічным выратаванні нацыі. “Новы курс” па выратаванні нацыі належаў наступнаму прэзідэнту, Франкліну Рузвельту – яшчэ адной выбітнай постаці на палітычным небасхіле Амерыкі.

Энергічны, поўны аптымізму лідэр дэмакратычнай партыі і нацыі ў цэлым, Ф.Рузвельт адразу сабраў каманду прафесіяналаў і смела рушыў наперад – да рэалізацыі Першага і Другога “новага курса”, што прадугледжвала ўзмоцнены кантроль і адказнасць федэральных уладаў. “Адзінае, перад чым мы павінны адчуваць страх, – гэта сам страх,” – заявіў у сваёй інаўгурацыйнай прамове Ф.Рузвельт. Першая група мер датычыла ўзмацнення банкаўскай сістэмы, другая была накіравана на аказанне прамой дапамогі беспрацоўным і арганізацыю дадатковых працоўных месцаў: служба грамадзянскай кансервацыі рэкрутавала моладзь для ўдзелу ў разнастайных прыродна-экалагічных, будаўнічых, сельскагаспадарчых і культурных праектах. У 1933 г. быў прыняты Нацыянальны закон аб аднаўленні прамысловасці, які прадугледжваў кантроль над прыватным прадпрымальніцтвам і прыняцце кодэксаў “сумленнай канкурэнцыі”, а таксама ільготныя ўмовы для развіцця бізнесу. Выкананне прамысловай

праграмы кантралявала Нацыянальнае ўпраўленне эканамічнага аднаўлення. Актыўна пашыраўся прафсаюзны рух: Ф.Рузвельт даў шанец працоўным арганізаваным шляхам адстойваць свае ўласныя інтарэсы. Яшчэ адна праграма Кангрэсу датычыла рэгіянальнага планавання і развіцця.

Кабінет Ф.Рузвельта прыняў меры і па выпраўленні ранейшых памылак. Быў праведзены закон аб індзейскай рэарганізацыі – практыка адбірання зямлі ў індзейцаў была спынена, а адабраныя некалі землі былі аддадзены пад кантроль плямёнаў, якія забяспечваліся сродкамі для выкупаў. Індзейцаў нарэшце перасталі лічыць ніжэйшай, падпарадкаванай расай. Было адноўлена самакіраванне плямёнаў – у адпаведнасці з іх уласнымі канстытуцыямі, якія падлягалі зацвярджэнню федэральным урадам. Закон забараняў гвалтоўную асіміляцыю індзейцаў. Была распрацавана праграма па ахове, вывучэнні і развіцці індзейскай спадчыны.

У краіне рэзка ўзрасла грамадская актыўнасць. Узнікла маса разнастайных народных рухаў, якія прапаноўвалі ўласныя схемы аднаўлення эканомікі і ўзбагачэння насельніцтва.

Другі "новы курс" 1935-1939 гг. быў пазначаны тым, што дэмакраты прынялі шэраг законаў, накіраваных на глыбокі кантроль адных слаёў насельніцтва і адначасова абарону і ўсебаковы пад'ём іншых. У выніку нацыя атрымала грандыёзную праграму рэформаў па ўстанаўленні сацыяльнай справядлівасці. Барацьба з беспрацоўем заключалася ў асноўным у тым, што людзей задзейнічалі ў федэральных праектах па пашырэнні нацыянальнай інфраструктуры і культурным развіцці нацыі. У 1935 г. быў прыняты адмысловы закон аб сацыяльнай бяспецы.

Такім чынам, праграмы Рузвельта прывялі да двух важных зменаў у амерыканскім жыцці: вырасла мера адказнасці федэральнага ўраду (быў пакладзены пачатак капіталістычнай дзяржаве дабрабыту), і ўрад стаў нязменным удзельнікам паўсядзённага жыцця шараговых грамадзян. Вялікі ўрад цяпер стаў неад'емнаю часткаю амерыканскага жыцця.

*Як бачым, у ЗША на глебе пераадолення Вялікай дэпрэсіі ўсё больш фундаментальна вырашаліся і пытанні забеспячэння грамадзянскіх правоў і роўнасці. Безумоўна, і ў Беларусі эканамічныя пытанні павінны вырашацца ў комплексе з іншымі сацыяльнымі пытаннямі.*

Канчатковая перамога над дэпрэсіяй у ЗША прыйшла толькі тады, калі амерыканцы ўступілі ў бой за межамі сваёй краіны.

Што датычыць міжнароднай палітыкі, то тут варта выдзеліць два ключавыя моманты: па-першае, амерыканцы імкнуліся навесці парадак у сябе дома, па-другое, яны былі расчараваныя ўдзелам ЗША ў Першай сусветнай

вайне. Кангрэс прыняў шэраг законаў аб нейтралітэце, чым быў узяты курс на незалежную палітыку і імкненне ўсімі сіламі пазбягаць нечаканых і непажаданых канфліктаў. Зацікаўленасць у гандлі з азіяцкімі краінамі (а значыць, і ў стабільнасці ў гэтым рэгіёне) змусіла Амерыку ў 1933 г. прызнаць СССР. Уступленне ж ЗША ў Другую сусветную вайну было актам вымушаным і непазбежным: 07 снежня 1941 г. японцы нанеслі ашаламляльны ўдар па ключавой ваеннай базе ЗША на Гаваях, што ў Ціхім акіяне, а праз тры дні вайну Амерыцы аб'явілі Германія і Італія. Калі ў Еўропе амерыканцы доўга ўстрымліваліся ад удзелу ў ваенных дзеяннях, то на ўсходзе ім давялося несці на сваіх плячах асноўны цяжар вайны. Амерыканскае рашэнне аб выкарыстанні ядзернай зброі ў Японіі стала самым спрэчным, асабліва ў плане ваенна-палітычных абставін, знешняй палітыкі і маральна-этычных нормаў.

У Другой сусветнай вайне ЗША страцілі каля 1 млн. чалавек (агульная лічба чалавечых стратаў па свеце – каля 50 млн. чалавек, пры гэтым больш за палову складаюць чалавечыя страты СССР). Гэта велізарная лічба для Амерыкі, якая не прывыкла ваяваць. Вайна дала новыя шанцы афраамерыканцам, якія імкнуліся даказаць сваю лаяльнасць і індывідуальную каштоўнасць, а таксама жанчынам, бо адкрыла для іх новыя сферы дзейнасці, перш за ўсё на фронце і ў вытворчасці. Нацысцкая дактрына аб расавай чысціні як крыніцы дзяржаўнай велічы нагадала амерыканцам пра неабходнасць пераадолення расавых перажыткаў у сябе дома. Вайна вызначыла на доўгія гады сістэму каштоўнасцей, акрэсліла паняцці справядлівасці і несправядлівасці паміж народамі.

Удзел у вайне ўзмацніў патрыятычны дух амерыканцаў, а імкненне да агульнай мэты спарадзіла небывалае пачуццё адзінства і гармоніі ў грамадстве. Гэтаму спрыяла і масавая культура Амерыкі, перш за ўсё музыка і кінематограф, напоўненыя пачуццём гонару (як песня "Бывай, мама, іду на Іакагаму", фільм "Назад у Батаан" і інш.), гумарам (фільм Спайка Джонса "Твар фюрэра", фільм "Быць ці не быць" Эрнста Любіча і інш.), але часцей за ўсё – горыччу і болем (песня "Я буду бачыць цябе", фільм "Пяшчотны сябар"). З'яўляліся і складаныя для аналізу творы, што будзілі цэлую гаму пачуццяў, як фільм "Касабланка" Майкла Керціса ці "Выратавальная шлюпка" Альфрэда Хічкока.

Аднак ніхто і ніхто не мог параўнацца ў фанатычнай народнай любові з Фрэнкам Сінатра – самым знакамітым эстрадным выканаўцам Амерыкі. Яго мяккі, гучны голас, манера па-свойму расстаўляць акцэнты ў рытме і тэксце песень, тонкае ўзаемадзеянне з публікай зрабілі Ф.Сінатра "сваім" для мільёнаў людзей. На працягу шасцідзесяці гадоў Ф.Сінатра не толькі

выступаў з канцэртамі, але і вызначаў аблічча амерыканскай папулярнай музыкі.

Пасля вайны ЗША сталі самай багатай, магутнай і квітнеючай дзяржавай на зямлі, якая мела ўсяго аднаго больш-менш годнага суперніка – Савецкі Саюз. Нягледзячы на прыналежнасць да аднаго ваеннага лагеру падчас вайны, пасля яе заканчэння ўзаемны недавер і варожасць сталі “нормай” у стасунках двух гігантаў. Халодная вайна спарадзіла жорсткую дуалістычную карціну барацьбы паміж капіталізмам і камунізмам, паміж асабістымі правамі і дзяржаўным кантролем, паміж Захадам і Усходам. У 40-50-ыя гг. мінулага стагоддзя Усход і Захад шматкроць сутыкаліся адзін з адным у цэлай серыі міжнародных крызісаў, палітычных дэмаршаў, адкрытых узброеных канфліктаў: можна ўзгадаць падзеі у Цэнтральнай Еўропе, у Іране, Вьетнаме, Карэі, Кітаі і інш. Славутае “стрымліванне” камунізму, як і захаванне ваеннай гатоўнасці, стала дзвюхпартыйнай мэтай у ЗША і паслужыла асновай амерыканскай знешняй палітыкі. Адданасць глабалізму, мілітарызму і прынцыпу стрымлівання – вось вызначальная рыса міжнароднай дзейнасці ЗША.

Узмацненню ролі прэзідэнта садзейнічаў закон аб нацыянальнай бяспецы, а неабходнасць яго лідэрства тлумачылася, апроч іншага, патрэбаю кансалідаваць надзвычай разнародную і схільную да раздробленасці нацыю, тым больш што ў 1945-1954 гг. амерыканцаў зноў ахапіла “чырвоная істэрыя” – страх перад савецкім шпіянажам і камуністычнай пагрозай, якая нібыта навісла над краінай. Ужо ў пачатку 80-ых гадоў стала ясна, што мілітарысцкая лінія сябе не апраўдвае, бо замест поспехаў за мяжой параджае глыбокае раз’яднанне ўнутры краіны. Пасля 30 гадоў халоднай вайны амерыканцы прызналі, што адзінае, чаго ўдалося дасягнуць, – гэта стрымаць амерыканскую моц і амерыканскі прэстыж.

Пасляваенны “бэбі-бум” і бум у развіцці прыгарадаў, разрастанне т.зв. “сонечнага пояса” (рассяленне амерыканцаў на захадзе, паўднёвым захадзе і поўдні) і інш. служылі ўскосным пацверджаннем таго, што амерыканцы ператварыліся ў самую багатую ў свеце нацыю з рэкордна высокім узроўнем жыцця. Краіна, дзе пражывала ўсяго 6% насельніцтва планеты, выпускала і выкарыстоўвала ажно 66% усіх прадукаваных у свеце тавараў. Прынята лічыць, што эканамічны бум звязаны з прыватным прадпрымальніцтвам, асабістым выбарам асобных амерыканцаў, аднак больш уважлівы аналіз дазваляе зрабіць выснову, што механізм ажыўлення рынку звязаны перш за ўсё з **грамадскімі** рашэннямі.

Сама **ідэя дзяржавы ўсеагульнага дабрабыту** ніколі не падвяргалася сумненню з боку амерыканцаў. Хвалявала іншае: ці варта і ў якой ступені пашыраць межы гэтай дзяржавы. Менавіта дэмакраты выступалі за

пашырэнне дзяржавы ўсеагульнага дабрабыту. Як сведчыць практыка, у спакойныя гады народ выбіраў рэспубліканцаў, дэмакратаў жа падтрымліваў тады, калі ўзнікала патрэба ў законатворчасці. На змену спакою, вытрымцы і асцярожнасці (прэзідэнт Д.Эйзенхаўэр) прыходзілі смеласць, дынамізм і энергія (прэзідэнт Дж.Кэнэдзі). Кожны амерыканскі прэзідэнт быў сапраўдным лідэрам нацыі, і таму мільёны вачэй, якія цягам тысячы дзён сачылі за энергічным, поўным жыццёвых сіл прэзідэнтам Кэнэдзі, у 1963 г., пасля забойства лідэра, пакрыліся слязамі. Імкненне забяспечыць роўныя магчымасці і для нацыянальных меншасцей, і для бедных слаёў легла ў аснову праграмы “Вялікага грамадства” наступнага прэзідэнта – Л.Джонсана, які стаў ахвярай палітычнага скандалу, так як яго пераемнік – прэзідэнт Р.Ніксан – ахвярай улады і асабістай маніі пераследу. На працягу двух дзесяцігоддзяў (1961 – 1981 гг.) ніводны з прэзідэнтаў не быў на сваёй пасадзе поўных два тэрміны. Паступова слабеў інстытут прэзідэнцтва, а ўпадак вытворчасці, фінансавая стагнацыя і песімістычныя настроі ў грамадстве ахарактарызавалі этап “абмежаванняў”.

У пасляваенны перыяд актывізавалася актыўнасць афраамерыканскага руху за свае грамадзянскія правы, супраць сегрэгацыі, які ўзначаліў Марцін Лютэр Кінг-малодшы. Прынцып негвалтоўнага супраціўлення, пачэрпнуты ў Махатмы Гандзі, і ідэя служэння, якая выцякала з “сацыяльнага евангелля”, склалі аснову праграмы М.Л. Кінга, які даказваў, што любоў, а не нянавісць здатная змяніць жыццё. Цярпенне і маўчанне аказаліся неэфектыўнымі, перамовы не даюць вынікаў, таму становішча можна выправіць, толькі калі ў грамадстве ўзнікне “напружанасць”. Задача барацьбітоў – стварыць гэтую напружанасць праз прамое дзеянне негвалтоўнымі метадамі. Узніклы крызіс немінуча прыцягне ўвагу ўраду да сацыяльнай несправядлівасці і прымусіць яго памяняць уласную прадузятую палітыку. У сваёй знакамітай прамове “У мяне ёсць мара…” у 1963 г. лідэр і душа амерыканскага руху за грамадзянскія правы ў якасці мэты імкненняў акрэсліў справядлівасць і чалавечае братэрства.

З часам ў руху за грамадзянскія правы ўзніклі разыходжанні: расчараванне ў маральным імперытыве Кінга выклікала заклікі да жорсткай самаабароны, да аддзялення афраамерыканцаў ад белых, безнадзейна інфіцыраваных расізмам, да ідэі ўзмацнення расавага гонару, сілы і салідарнасці. Аднак эканамічнае, класавае расслаенне афраамерыканскага насельніцтва прывяло да раздробленасці ў іх асяроддзі. Разам з тым, барацьба афраамерыканцаў за свае грамадзянскія правы прадэманстравала іншым нацыянальным меншасцям важнасць актыўнай арганізацыі для абароны групавых інтарэсаў.

Аднак самае страшнае жабрацтва, самы высокі ўзровень беспрацоўя і самыя горшыя ўмовы жыцця ў ЗлучаныхШтатах выпалі на долю індзейцаў. Частка індзейскіх лідэраў спрабавала адрадзіць культурную спадчыну, іншыя рабілі стаўку на палітычныя стратэгіі. У 1968 г. Кангрэс прыняў закон аб грамадзянскіх правах індзейцаў, які распаўсюдзіў на індзейскія рэзервацыі многія гарантыі "Біля аб правах", адначасова пацвердзіўшы суверэнітэт плямёнаў. Некаторыя групы, як "Рух амерыканскіх індзейцаў", імкнуліся выкарыстоўваць ваенныя метады.

Увогуле супольнасці, пабудаваныя па расавай і этнічнай прыкметах, часта пазіцыянуюць сябе як прадстаўнікі "іншай" Амерыкі, якая церпіць крызіс і развальваецца на часткі.

У 1970-ых гадах Амерыка стала асяроддзем небывалага росквіту фемінізму. Правакацыйная кніга Беці Фрыдэн "Тайна жаноцкасці" закранала праблему, якую ніхто раней не хацеў абмяркоўваць, а менавіта ідэал жанчыны свабоднай, незалежнай, самастойнай, якая рэалізуе сябе не праз сексуальную пасіўнасць, прызнанне панавання мужчын і мацярынскую любоў. Праблема пачала дыскутавацца, паўсталі жаночыя арганізацыі, сталі праводзіцца масавыя мерапрыемствы, у тым ліку акцыі пратэстаў.

Амерыканскае грамадства сутыкнулася таксама з праблемай "бацькоў і дзяцей", калі паўсталі сур'ёзныя супярэчнасці паміж пакаленнямі. Узнікла асобая маладзёжная субкультура, якая супрацьпастаўляла сябе традыцыйным каштоўнасцям. Прадстаўнікі літаратурнай плыні "бітнікаў" (як Ален Гінсберг ці Джэк Кіруак) прапагандавалі пачуццёвасць, непрадказальнасць, пратэст. Іх творы абвінавачвалі канфармізм грамадства, якое пераўтварылася ў бяздушную пустыню для свабоднай асобы. Маладзёжныя фільмы ("Бунтар без прычыны", "Дзікун", "Школьныя джунглі") былі прысвечаныя праблеме падлеткавай злачыннасці і пабілі ўсе рэкорды. Рок – музыка, якая брала свае карані ў афраамерыканскім рытме-энд-блюзе, была жорсткай, агрэсіўнай і сексуальнай. Асабліва адмыслова яна гучала ў выкананні куміра моладзі Элвіса Прэслі. Рок-н-рол стаў галоўным прадуктам музычнага экспарту ЗША.

У 70-ыя гады склалася асаблівая палітызаваная "контркультура", заснаваная на псіхалогіі адчужэння, усходнім містыцызме і эксперыментах па стварэнні разнастайных камун. Дзейнасць студэнцкіх арганізацый вызначалі пратэст, рэформы і паўстанні ("Студэнты за дэмакратычнае грамадства" і інш.).

*Такім чынам, маладзёжны рух разам з рухам афраамерыканцаў, лацінаамерыканцаў, карэнных індзейцаў і феміністак разбурае ўяўленне пра ЗША як пра "плавільны кацёл", дзе губляецца нацыянальная самабытнасць і фарміруецца новы гамагенны вобраз з назваю "амерыканскі характар". Злучаныя Штаты заставаліся "нацыяй нацый" – краінай шматаблічнай,*

*полікультурнай, дзе пытанне адзінства і раздробленасці стала цэнтральнай праблемай культурнага жыцця Амерыкі.*

Канец мінулага стагоддзя актывізаваў кансерватыўныя тэндэнцыі ў грамадска-палітычным мысленні амерыканцаў, а рэйганаўская палітыка абапіралася на рэстаўрацыю індывідуалізму замест калектывізму. Чакалася, што прыватная ініцыятыва пераможа дзяржаўны кантроль, ваенная магутнасць – мяккацеласць, а нацыянальныя каштоўнасці – няўцямны “рэлятывізм”. Р.Рэйган закляйміў Савецкі Саюз як “імперыю зла”, якая вядзе падрыўную дзейнасць ва ўсім свеце. Савецкі Саюз абвінавачваўся ў дэстабілізацыі дэмакратычных рэжымаў, падштурхоўванні да рэвалюцый і панаванні дзяржавы над народам. ЗША адкрыта падтрымлівалі любыя антыкамуністычныя рухі.

Нягледзячы на тое, што пры Р.Рэйгане расслаенне амерыканскага грамадства не зменшылася, прэзідэнт карыстаўся велізарнай папулярнасцю. Магчыма, гэта было звязана з тым, што ў сваёй дзейнасці ён замест трывогі выказваў упэўненасць, аддаваў перавагу індывідуалізму замест дзяржаўнасці, прадпрымальнасці замест жорсткага рэгулявання і сусветнаму лідэрству – замест дыпламатычнай асцярожнасці.

Са свайго боку, Дж.Буш прадэманстраваў усяму свету стратэгічнае майстэрства, тэхналагічную перавагу і палітычную сілу Злучаных Штатаў. Чаго вартая адна праграма “Тысяча кропак святла”, ўдзельнікі якой спрабавалі самастойна, без дапамогі і падтрымкі ўраду змяніць жыццё да лепшага ў сваёй краіне.

Прадстаўнік трыумфу цэнтра – прэзідэнт Біл Клінтан – разглядаў урад як апошнюю і самую верную надзею на прагрэс і справядлівасць.

Усе тры гэтыя лідэры – Р.Рэйган, Дж.Буш і Б.Клінтан – ўдыхнулі новае жыццё ў Белы дом і зрабілі яго цэнтрам нацыянальнай магутнасці.

Сорак трэці прэзідэнт ЗША, Джордж Буш-малодшы, праз некалькі месяцаў пасля свайго ўступлення на пасаду сутыкнуўся з падзеяй, якая падзяліла свет на “да” і “пасля”: 11 верасня 2001 г. у ЗША адбылася серыя буйных тэрактаў, у адказ на якую Дж.Буш аб’явіў глабальную “вайну супраць тэрарызму”. Хаця ў сваёй перадвыбарнай праграме Дж. Буш-малодшы рабіў акцэнт на ўнутранай палітыцы, на ідэі спачувальнага кансерватызму, падзеі 11 верасня змусілі яго радыкальна змяніць курс.

Сын студэнта з Кеніі Барак Хусейн Абама, сенатар штата Ілінойс, сорак чацвёрты прэзідэнт ЗША, – лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру 2009 г. з фармулёўкай “за экстраардынарныя намаганні ва ўмацаванні міжнароднай дыпламатыі і супрацоўніцтва паміж людзьмі”. Абама стаў трэцім прэзідэнтам ЗША, пасля Тэадора Рузвельта і Відро Вільсана, які атрымаў Нобелеўскую

прэмію міру падчас знаходжання на пасадзе (яна была таксама прысуджана экс-прэзідэнту Дж.Картэру).

Цікава, што Барак Абама заявіў сваю кандыдатуру на пост прэзідэнта перад старым Капітоліем штата Ілінойс у Спрынгфілдзе, дзе Абраам Лінкольн у 1858 г. выступіў з гістарычнай прамовай “Падзелены дом”. У сваёй прамове Б.Абама заклікаў да “новай эры адказнасці”. Прысяга прыносілася на той жа Бібліі, на якой кляўся пры інаўграцыі Абраам Лінкольн.

Абама стаў першым і пакуль адзіным кандыдатам у прэзідэнты, які адмовіўся ад дзяржаўнага фінансавання сваёй перадвыбарнай кампаніі. Лозунгі яго кампаніі – “Перамены, у якія мы можам паверыць” і “Так, мы можам!”

Сёння ЗША дэманструюць вялікія поспехі ў рэалізацыі сацыяльных праграм: дапамогі бедным, барацьбы з беспрацоўем, расавай дыскрымінацыяй, злачыннасцю і інш. Амерыканская нацыянальная валюта забяспечвае эканамічную стабільнасць для многіх дзяржаў. Імкліва развіваюцца навейшыя навукаёмкія галіны і віды вытворчасці: мікраэлектроніка, лазерная тэхніка, біятэхналогія, робататэхніка, сістэмы аўтаматызаванага праектавання і інш. Амерыканскія сацыёлагі адзначаюць пад’ём даверу да ўлады.

Спрадвечна амерыканскія каштоўнасці – імкненне да ўплыву, захаванне прынцыпаў свабоды і роўнасці – па-ранейшаму валодаюць незвычайнай прывабнасцю ў вачах амерыканскага народа, які заўсёды знаходзіцца ў стане пошуку і таму заслугоўвае мець найлепшае.

God bless America!

**Спіс выкарыстаных крыніц**

*(апроч спасылак, дадзеных у раздзеле 5):*

Баршчэўская, Н. Беларуская эміграцыя – абаронца роднае мовы / Н. Баршчэўская – Варшава, 2004.

Мацкевич, В.В. Переоценка ценностей в культуре и истории Беларуси / Владимир Мацкевич. – Минск: И.П.Логвинов, 2010.

Меньковский, В.И. История и историография: Советский Союз 1930-х годов в трудах англо-американских историков и политологов / В.И. Меньковский. – Минск: БГУ, 2007.

Стоун, И. Любовь вечна, или Мэри Тодд и Авраам Линкольн / Пер. с англ. И. Г. Усачева. – М.: Мысль, 1994.

Уітмен, У. Лісце травы. – Мн.: Маст. літ., 1978.

Caldwell W.W. American Narcissism: The Myth of National Superiority. New York, 2006.

Cooper F. Colonialism in Question. Theory, Knowledge, History. Berkeley, 2005.

Czas Ameryki. Pod red. Haliny Parafianowicz – Bialystok: Trans Humana, 2011.

Daniel J.McInerney. A Traveller’s History of the USA. – 2001.

David Brion Davis. The Great Republic: A History of American People / Ed. Bernard Bailyn et al.Lexington, Mass., 1985.

David Rich Lewis. Still Native: The Significance of Native Americans in the History of the Twentieth-Century American West // A New Significance: Re-envisioning the History of the American West / Ed. Clyde A. Milner II. New York, 1996.

Dyboski R. Amerykanizm [Americanism]. Warsaw, 1932.

Hao Z. Macau. History and Society. Macao, 2011.

Madsen D.L. American Exceptionalism. Edinburg, 1998.

Nathan O. Hatch. The Democration of American Christianity. New Haven, 1989.

Parafianowicz H. Eleanor Anna Roosevelt w cieniu wielkiego meza. Warszawa, 2000.

Parafianowicz H. Zapomniany prezydent. Biografia polityczna Herberta Clarka Hoovera, 1874-1964. Bialystok, 1993.

Robert D.Schulzinger.American Diplomacy in the Twentieth Century. New York, 1994.

Rosenberg E.S. Spreading the American Dream: American Economic and Cultural Expansion, 1890-1945. New York, 1982.

Stearns P.N. World History. The Basics. London – New York, 2011.

The Constitution of the United States of America (1987).

The World Almanah and Book of Facts, 1999. Mahwah; New Jersey, 1998.

James M.McPherson. What They FoughtFor: 1861 – 1965. New York, 1995.

Waters M. Globalization. London, 1995.

William L. Barney. The Passage of the Republic: An Interdisciplinary History of Nineteenth-Century America. Lexington, Mass., 1987.

World and Global History: Research and Teaching / edited by Seija Jalagin, Susanna Tavera, Andrew Dilley- Pisa: Plus –Pisa University Press, 2011.

http://www.census.gov/main/www/popclock.html

http://egsc.usgs.gov/isb/pubs/booklets/elvadist/elvadist.html

http://egsc.usgs.gov/isb/pubs/booklets/elvadist/elvadist.html

https://www.cia.gov/library/publications/the-world-factbook/geos/us.html

**Любоў Уладыкоўская**

# АДКРЫЦЦЁ МАЁЙ АМЕРЫКІ,

**або**

# навошта беларусам ЗША?

УДК 008 (476)

ББК 71.4 (Беі)

У47

Навукова-папулярнае выданне

Навуковы рэцэнзент: *Уладзімір Карагін*, Старшыня Вышэйшага Каардынацыйнага Савета Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва, Старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў

Рэдактар: *Раман Канаплянік*

У кнізе прапануецца агляд станаўлення амерыканскай нацыі і фарміравання “амерыканскага феномену”, а таксама аўтарскае бачанне тых карысных урокаў у сацыякультурным жыцці, якія варта было б засвоіць беларусам.

Для шырокага кола чытачоў.